

ВЯСКОВАЯ РОБАТАТЭХНІКА

ЧЫРВОНКА

ЧАМУ СПЯВАЮЦЬ ЗА РУЛЁМ КАРТА?

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родnай мове

# ЗВЯЗДА

17 КАСТРЫЧНІКА 2019 г. ЧАЦВЕР № 198 (29065)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«Тэма неабгрунтаванага пасрэдніцтва не новая. З гэтай праблемай мы змагаемся як мінімум гадоў дзесяць: яшчэ ў 2009-м Камітэт дзяржкантролю правёў комплексныя праверкі асобных арганізацый і выявіў факты неабгрунтаванага і нядобрасумленнага пасрэдніцтва пры закупках тавараў. Яно пранікла практычна ва ўсе сферы жыццядзейнасці краіны, вядзе да росту сабекошту прадукцыі, зніжэння даходаў прадпрыемстваў. Церпіць дзяржаўны бюджэт і эфектыўнасць эканомікі ў цэлым. Па розных ацэнках, пасрэднікі з'ядаюць да 3 % ад ВУП — сума вельмі сур'ёзная».*

# З ДАСТАЎКАЙ НА МЕСЦА



Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БелТА.

**У Людмілы і Анатоля КАЖАНЕЎСКІХ з вёскі Масткі Гродзенскага раёна немалая падсобная гаспадарка. Ад дома да пашы, на якой дояць кароў, больш за кіламетр. Для таго каб дабірацца туды, набылі мотаблок. З'явіўся і дальны апарат, а для забеспячэння яго энергіяй купілі генератар.**

**Тады і нарадзілася ідэя накрыць усё абсталяванне «дахам» — прычэп ад мотаблока сумясцілі з задняй часткай кузава старэнькага легкавіка. Перасоўная дойка не баіцца непагадзі, з лёгкасцю даязджае туды, дзе пасвяцца каровы, а кіраваць ёй можа сама гаспадыня.**

## КОРАТКА

- **Наша краіна ўваходзіць у топ-5 папулярных сярод турыстаў краін з недарагой хуткай ежай.**
- Міліцыя сёлета канфіскавала амаль 500 кг наркотыкаў і псіхатропаў.
- **У краіне пашырылі магчымасці працаўладкавання людзей, якія стаяць на ўліку ў нарколага.**
- Вызначаны пераможцы конкурсу сцэнарыяў іграваых фільмаў «Мая Беларусь».
- **Нашы, польскія і нямецкія ратавальнікі правядуць сумесныя вучэнні ў Брэсцкай вобласці.**
- Інстытут даследаванняў Беларусі адкрыты ў Кітаі. Асноўным відам яго дзейнасці будзе работа з беларускімі ўстановамі адукацыі па вывучэнні і параўнальным аналізе кірункаў развіцця нашай краіны і Кітая.

Усё пра грошы

## ВОЧЫ НІКОЛІ НЕ СХЛУСЯЦЬ

### Што цікавага было на Міжнароднай нумізматычнай канферэнцыі

**Сёлета яна прымеркавана да 25-годдзя з моманту заканадаўчага замацавання беларускага рубля ў якасці адзінага законнага плацежнага сродку. Адпаведнае рашэнне было прынята Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 19 кастрычніка 1994 года.**

СТАР. 4



Гэта белары. Так маглі выглядаць беларускія грошы, калі б Нацбанк у 1991 годзе прыслухаўся да меркавання нумізматаў. А сёння гэта проста незвычайныя манетападобныя жэтоны.

Рэйд са «Звяздой»

## Нядрэнная альтэрнатыва папраўчай установе,

### або Як адбываюць пакаранне асуджаныя да абмежавання волі «ў хатніх умовах»

**«Хатняя хімія» — гэта турма, толькі на свабодзе», — з сарказмам кажуць самі асуджаныя пра абмежаванне волі без накіравання ў папраўчую ўстанову. А вось супрацоўнікі крымінальна-выканаўчай інспекцыі называюць яе нядрэннай у плане выпраўлення альтэрнатывай апошняй. Чалавек знаходзіцца дома, а не ў месцах пазбаўлення волі, працуе, дапамагае сям'і — і адначасова адбывае пакаранне. Адметна, што большая частка такіх асуджаных сапраўды становіцца на шлях выпраўлення. Для іншых жа гэта ператвараецца ў сапраўднае выпрабаванне, дзе немагчыма супрацьстаяць усім спакусам, у прыватнасці алкаголю. І пасля шэрагу парушэнняў яны ўсё ж адпраўляюцца ў месцы пазбаўлення волі. Пра тое, як жывуць і працуюць (а таксама парушаюць рэжым) асуджаныя да «хатняй хіміі», што прымушае ўзяцца за розум і без прыгод не толькі адбыць прызначаны судом тэрмін, але нават і вызваліцца датэрмінова, даведаліся карэспандэнты «Звязды», наведаўшы такіх людзей разам з супрацоўнікамі крымінальна-выканаўчай інспекцыі Савецкага РУУС сталіцы — старшым інспектарам Сяргеем ЖУРКО і інспектарам Кірылам МІЦЬКО.**

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

19198>

9 771990 763008

# КАБ НЕ НАЖЫВАЛІСЯ

## Прэзідэнту ўнеслі на разгляд праект указа па барацьбе з нядобрасумленным пасрэдніцтвам

«Думаю, што кіраўнік дзяржавы пойдзе на тое, каб правесці спецыяльную нараду па гэтым праекце ўказа і разгледзець у комплексе ўсе пытанні, звязаныя з неабгрунтаваным, нядобрасумленным пасрэдніцтвам», — расказаў журналістам **старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід АНФІМАЎ.**

Паводле яго слоў, праект указа прадугледжвае абавязковае ўзгадненне з вышэйшымі арганізацыямі закупак, калі яны ажыццяўляюцца за кошт дзяржаўных грошай.

«Калі вы хочаце купіць які-небудзь тавар у пасрэдніка, то павінны ўзгадніць закупку. Калі гэта калгас, і ён знаходзіцца ў камунальнай уласнасці, то з тым органам, які ажыццяўляе ўладальніцкі нагляд, у каго знаходзяцца акцыі прадпрыемства», — растлумачыў старшыня КДК. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што размова ідзе аб закупках пэўнай цэнавай катэгорыі.

«Думаю, пэўная сума будзе ўсё ж такі стаяць і лімітавацца як мяжа закупкі, якую можа ажыццяўляць прадпрыемства без дазволу адпаведнага органа», — адзначыў Леанід Анфімаў.

**Паводле БелТА.**

Выбары-2019

# СПАКОЙНА І ПЛАНАМЕРНА

## Ужо больш за 700 замежных наглядальнікаў акрэдытавана для назірання за выбарамі ў беларускі парламент

**Па запрашэнні беларускіх улад наглядальнікі ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ адкрылі місію па назіранні за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Асноўная група місіі складаецца з 11 экспертаў, што базіруюцца ў Мінску. 30 доўгатэрміновых наглядальнікаў будуць працаваць па ўсёй краіне з 23 кастрычніка. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе АБСЕ. Прадстаўнікам місіі ўжо ўручаны акрэдытацыйныя пасведчанні.

Акрамя таго, чакаецца, што дзяржавы — удзельніцы АБСЕ накіруюць 400 кароткатэрміновых наглядальнікаў, якія прыбудуць у Беларусь за некалькі дзён да выбараў.

Місія ацэніць праведзенне выбараў на адпаведнасць абавязацельствам у рамках АБСЕ і іншым міжнародным абавязацельствам і стандартам дэмакратычных выбараў, а таксама нацыянальнаму заканадаўству. Неад'емнай часткай назірання стануць сустрэчы з прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады, палітычных партый, грамадзянскай супольнасці, сродкаў масавай інфармацыі і міжнароднай супольнасці.

Наглядальнікі ад Садружнасці незалежных дзяржаў пачалі работу ў Беларусі 4 верасня. Цяпер місія СНД канстатуе вялікую ўвагу з боку ўсіх структур улады Беларусі да падрыхтоўкі да выбараў. Агульная задача, якая пастаўлена на самым высокім узроўні, — забяспечыць годнае правядзенне выбараў, правы грамадзян Беларусі на свабоднае волевыяўленне. Вядзецца рэгістрацыя наглядальнікаў ад СНД. Заяўкі паступаюць ад усіх дзяржаў-членаў.

«Ужо цяпер зарэгістраваны 302 наглядальнікі з краін Садружнасці, якія пачнуць назіранне напярэдадні выбараў. Яны звычайна прыязджаюць дні за тры-чатыры. Мы думаем, што агульная колькасць нашай місіі складзе прыкладна 400 чалавек», — цытуе карэспандэнт БелТА **старшыню Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Сяргея ЛЕБЕДЗЕВА.**

У склад місіі ўключаны дэпутаты парламентаў краін Садружнасці, прадстаўнікі ЦВК, дыпламаты краін СНД, акрэдытаваныя ў Мінску.

«Ніякай інфармацыі аб скаргах у пракуратуру, МУС, з якімі мы ў цесным кантакце, пакуль не атрымлівалі, — адзначыў Сяргей Лебедзеў. — Але мы сочым за сітуацыяй. Зразумела, калі будуць нейкія скаргі, будзем іх фіксаваць. А рэагаваць будуць адпаведныя органы Беларусі».

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# ВАЖНА ПАДТРЫМАЦЬ ЧАЛАВЕКА

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ правёў прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян у Жыткавіцкім раёне.**



Адна з задач мясцовай улады — падтрымаць жаданне людзей развіваць фермерскія гаспадаркі, адзначыў кіраўнік Гомельшчыны. Кірунак для канструктыўнай размовы на гэтую тэму задаў Сяргей Адамовіч з вёскі Пухавічы, які прыйшоў на прыём. Ён прасіў вырашыць пытанне з выдзяленнем участка з сельскагаспадарчых зямель для развіцця ўласнай фермерскай гаспадаркі. Гаворка ішла пра гектар зямлі, дзе ён плануе вырошчваць буякі. Жыхар вёскі нагледзеў ідэальны для абранай культуры варыянт, аднак зямля знаходзіцца ва ўласнасці аднаго з мясцовых прадпрыемстваў.

«Вырошчванне гэтых ягад — нялёгкая праца. Разам з тым гэта знакавая для Гомельшчыны культура, якая спрыяе вывядзенню з арганізма радыенуклідаў. Важна і трэба гэтым займацца. Ёсць жаданне ў чалавека працаваць на зямлі — трэба даць яму такую магчымасць. Важна падтрымаць яго», — акцэнтаваў увагу старшыня аблвыканкама. Ён даручыў адпаведным службам у двухтыднёвы тэрмін прапанаваць сяльчаніну ўзаемавыгадны варыянт.

Адразу некалькі тэм агучыла жыхарка райцэнтра Надзея Лядвік. Яна хвалявалася з нагоды тэрмінаў тэрмарэнавацыі дома, у якім жыве ўжо 35 гадоў. Жанчыну запэўнілі, што, згодна з зацверджанай у райвыканкаме праграмай, яе дом ёсць у спісах на ўцяпленне на 2019—2020 гады.

Расказала заяўніца і пра адсутнасць у гарадской паліклініцы ўрача-эндакрынолага. Як паведамілі ў райвыканкаме, дадатковае навучанне прайшоў урач агульнай практыкі, які цяпер можа кансультаваць і ў якасці эндакрынолага. Вызначаны дзень, калі ён будзе прымаць менавіта па гэтым профілі.

Жанчына таксама паскардзілася і на дрэннае вулічнае асвятленне ў зоне, дзе мясцовыя жыхары любяць займацца скандынаўскай хадой. Для актыўных грамадзян створана і добраўпарадкавана сцежка здароўя. Трэба сказаць, што ў райвыканкаме цэняць актыўную пазіцыю жанчыны і аператыўна рэагуюць на яе звароты, якія дапамагаюць добраўпарадкоўваць райцэнтр і рабіць жыццё людзей яшчэ больш камфортным.

Тэму стварэння адзінай гісторыка-патрыятычнай канцэпцыі і праграмы маштабных мерапрыемстваў узняў кіраўнік Беларускага ваенна-гістарычнага клубнага аб'яднання «Гонар мундзіра» Уладзімір Колат. Губернатар даручыў прапрацаваць маштабную праграму на год, у якую будуць уключаны і мерапрыемствы з удзелам гэтага гістарычнага аб'яднання.

Па словах Генадзя Салаўя, у вобласці вялікая ўвага ўдзяляецца захаванню памяці і патрыятычнаму выхаванню моладзі. Сёння ў рэгіёне прапрацоўваюцца некалькі гісторыка-патрыятычных праектаў па стварэнні месцаў памяці пра вызваліцеляў рэгіёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Напярэдадні 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне гэты аспект набывае асаблівае гучанне.

Прыблізна ў кожным чацвёртым званку на тэлефонную лінію гучалі словы ўдзячнасці ў адрас мясцовых і абласных органаў улады за дапамогу ў вырашэнні надзённых праблем. Так, жыхарка аграгарадка Рычоў Галіна Леўкавец падзякавала за падтрымку ў справе ўзвядзення моста праз раку Ствігу.

Таксама грамадзяне ўзнімалі пытанні добраўпарадкавання дваровых тэрыторый і дарожнай гаспадаркі, развіцця гандлёвай сеткі, упарадкавання збору і вывазу смецця ў прыватным сектары. Па кожным з іх дадзены даручэнні і вызначаны тэрміны вырашэння праблем.

**Падрыхтаваў Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# Марка ў гонар сувязістаў



Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100 год войскам сувязі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь». Цырымонія гашэння прайшла ў Цэнтральным доме афіцэраў.

Юбілей войскі сувязі адзначаць 20 кастрычніка. У гэты дзень у 1919 годзе было сфарміравана ўпраўленне сувязі Чырвонай Арміі, франтоў і армій, а таксама аддзелы сувязі дывізій і брыгад. Задача на сувязістаў ускладзена вельмі адказная: каардынаваць работу іншых злучэнняў і падраздзяленняў.

— Патрэбнасць у сродках кіравання была заўжды, — заявіў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.** — І ў мірны час за іх плячыма ўжо была безліч вучэнняў, даследаванняў, творчых пошукаў. Войскі здзейснілі гіганцкі тэхнічны прарыў. І зараз яны ўяўляюць сабой найбольш падрыхтаваную частку арміі, якая па сваім аснашчэнні і прафесіяналізме дазваляе выдатна выконваць задачу кіравання войскамі.

Як жа сувязісты рыхтуюцца да свайго прафесійнага свята?

— Мы сустрэліся з ветэранамі практычна ва ўсіх гарнізонах, правялі ў Баранавічах лёгкаатлетычны крос, — расказвае **начальнік сувязі Узброеных Сіл Алег МІШЧАНКА.** — Марку заслужыць не так і проста. Мы аддаём даніну памяці тым, хто калісьці ствараў падмурак сучасных войскаў сувязі.

Марка аддрукавана тыражом у 36 тысяч экзэмпляраў. Яе намінал адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна ў межах Беларусі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МВФ панізіў прагноз росту сусветнай эканомікі

Міжнародны валютны фонд панізіў сёлетні прагноз росту сусветнай эканомікі да трох працэнтаў. Гэта найгоршы паказчык з часоў глабальнага фінансавага крызісу 2008—2009 гадоў. Пра тое гаворыцца ў дакладзе МВФ. У 2020 годзе рост, як мяркуецца, складзе 3,4 працэнта. Эксперты не выключаюць, што і гэты прагноз можа быць пагоршаны, калі напружанне ў глабальным гандлі захаваецца, а зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці ў свеце не спыніцца. МВФ таксама панізіў прагноз па росце эканомік ЗША і Кітая на 2019 год. Раней прадстаўнікі арганізацыі заяўлялі, што, паводле іх ацэнак, толькі з-за гандлёвага канфлікту паміж Вашынгтонам і Пекінам глабальная эканоміка страціць 0,8 працэнта. Несуцяшальныя прагнозы і для еўразоны. Сярод прычын эканамісты называюць другасныя эфекты ад гандлёвай вайны паміж ЗША і Кітаем, старэнне насельніцтва і нізкую прадукцыйнасць працы ў развітых эканоміках.

### У Каталоніі з-за беспарадкаў пацярпела каля 200 чалавек

Служба па надзвычайных сітуацыях Каталоніі паведаміла, што аказала медыцынскую дапамогу 125 пацярпелым, з іх 74 у Барселоне. Акрамя таго, раненні і траўмы атрымалі больш за 70 сілавікоў: 54 супрацоўнікі каталонскіх Mossos de Escuadra і 18 — Нацыянальнай паліцыі. Затрыманы 51 чалавек (з іх 29 у Барселоне), чатыры машыны праваахоўных органаў пашкоджаны мітынгоўцамі. Толькі ў ноч на сераду ў каталонскай сталіцы пратэстоўцы зладзілі 157 барыкад з вогнішчамі. Акрамя таго, чыгуначная кампанія Renfe паведаміла пра тое, што перапынены высакаскорасныя зносіны паміж Фігерасам, Жыронай і Барселонай з-за дзеянняў вандалаў. «Відавочна, што гаворка ідзе не аб мірным грамадзянскім руху, а аб дзеяннях, скаардынаваных экстрэмістамі, якія выкарыстоўваюць вулічны гвалт, каб парушыць спакой у Каталоніі», — заявілі ў іспанскім урадзе. Як вядома, акцыі пратэсту ў Каталоніі пачаліся ў панядзелак, пасля таго як Вярхоўны суд вынес прысуд каталонскім палітыкам у сувязі з іх дачыненнем да правядзення незаконнага рэферэндуму аб незалежнасці ў 2017 годзе.

### Кім Чэн Ын падняўся на святую гару Пэктусан верхам на белым кані



Паўночнакарэйскі лідар Кім Чэн Ын падняўся на самую высокую вяршыню на Карэйскім паўвостраве, паведамляе Цэнтральнае тэлеграфнае агенцтва Карэі (ЦТАК). У агенцтве адзначаюць, што гэта было здзейснена на белым кані «па першым снезе». Акрамя таго, Кім Чэн Ын наведаў спецыяльную турыстычную зону, якая будуецца ў павеце Самджыен каля падножжа гары. Паўночнакарэйскі лідар таксама заявіў, што краіна павінна прыкласці больш намаганняў, каб «добра жыць пад сцягам вялікага духу самазабеспячэння». «Боль, які варожыя сілы ЗША пад кіраўніцтвам сіл, настроеных супраць КНДР, нанеслі карэйскаму народу, больш не з'яўляецца болем, але ёнператвараецца ў гнеў», — заўважыў Кім Чэн Ын. Гара Пэктусан лічыцца адным з самых святых месцаў паўвострава. Звычайна паўночнакарэйскі лідар наведвае яе напярэдадні вялікіх палітычных ці дыпламатычных рашэнняў і падзей.

## У гасцях — культура Туркменістана

**З 16 да 19 кастрычніка ў Мінску і па іншых адрасах нашай краіны праходзяць Дні культуры Туркменістана ў Беларусі.**

У праграме — сустрэча афіцыйнай часткі дэлегацыі ў Міністэрстве культуры, якая праходзіць сёння, выстаўка музейных каштоўнасцяў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Прыгажосць і дзіўныя мясціны Туркменістана» ў фае Беларускай дзяржаўнай філармоніі, канцэрт майстроў мастацтва Туркменістана ў вялікай зале Белдзяржфілармоніі. На пятніцу запланавана сустрэча работнікаў культуры Туркменістана і нашай краіны ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

У кінатэатры «Беларусь» у Мінску ў пятніцу пройдзе прагляд туркменскіх кінафільмаў. Таксама шэраг мерапрыемстваў адбудзецца ў Магілёве — на пляцоўцы абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы.

Варта нагадаць, што з Туркменістанам у нашай краіны — трывалыя гуманітарныя, асветніцкія сувязі. Пра гэта сведчыць і колькасць туркменскіх студэнтаў, якія вучацца ў розных беларускіх ВНУ. Асобна трэба было б згадаць і туркменска-беларускія літаратурныя сувязі, якія ў апошнія некалькі гадоў набываюць самае шырокае распаўсюджанне. Параўнальна нядаўна быў выдадзены ёмісты том вершаў Махтумкулі ў перакладзе на беларускую мову. За арганізацыю гэтага творчага праекта беларускія літаратары Казімір Камейша і Ганад Чарказян былі ўзнагароджаны ордэнам Махтумкулі. У Мінску выйшлі кнігі Гурбангулы Бердымухамедава, Агагельды Аланазарава, Касыма Нурбадава ў перакладзе на беларускую мову.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# САМЫ ТРЫВАЛЫ НОСЬБІТ ІНФАРМАЦЫІ

**Учора ў Мінску ў Доме Масквы адкрылася праваслаўная выстаўка-форум «Радасць Слова».**

Арганізатары звяртаюць увагу, што абодва словы ў назве выстаўкі пішуцца з вялікай літары, бо «Слова» тут маецца на ўвазе тое, пра якое сказана ў першым радку Дабравесця паводле Іаана: «Напачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Богам было Слова».

— Сёння, нягледзячы на існаванне шэрагу сродкаў масавай інфармацыі, новых інфармацыйных тэхналогій, мы да кнігі ставімся асабліва: з трапятаннем, натхненнем. Часам у адрас Царквы можна пачуць папрок у кансерватызме, у тым, што яна не ідзе ў нагу з часам. Але само слова «кансервацыя» (або «кансервант») — добрае, гэта ўменне захаваць найлепшы вопыт, назапашаны народам і Царквой цягам стагоддзяў. Таму мы ўсё тое добрае захоўваем, спрабуем павялічыць і перадаць будучым пакаленням, — сказаў журналістам перад адкрыццём выстаўкі **мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.** — Кніга мае асаблівае значэнне для чытача, яна дысцыплінуе, дапамагае падыходзіць творча да падзей, якія апісвае, і ў адрозненне ад кінематографа робіць самога чытача і рэжысёрам, і выканаўцам... Кніга нас прымушае думаць, таму яна ніколі не знікне з жыцця чалавека.

Мітрапаліт Павел выказаў спадзяванне, што выстаўка будзе запатрабаваная жыхарамі краіны, якія любяць чытаць кнігі і цэняць іх.

Разам з кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы выстаўку адкрываў **мітрапаліт Калужскі і Бароўскі КЛІМЕНТ, старшыня Выдавецкага савета Рускай праваслаўнай царквы.** Ён перш за ўсё перадаў усім удзельнікам выстаўкі, жыхарам Мінска і Беларусі благаславенне Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла. Епіскап таксама ўпэўнены, што папяровая кніга застанецца ва ўжытку будучых пакаленняў.



Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ПАВЕЛ, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі *(злева)* і мітрапаліт Калужскі і Бароўскі КЛІМЕНТ, старшыня Выдавецкага савета Рускай праваслаўнай царквы.

— Ужо больш за дзесяць гадоў на амерыканскім рынку папяровая і электронная кніга трымаюць свае долі: 80 працэнтаў першая і 20 працэнтаў — другая. Нашы крамы запоўнены кнігамі, пры гэтым асартымент літаратуры, якая друкуецца ў Расіі, павялічыўся за апошнія дзесяцігоддзі ў дзясяткі разоў, — аргументаваў мітрапаліт Клімент. — Выдавецкі савет Рускай праваслаўнай царквы штогод дае грыф на публікацыі каля дзвюх тысяч найменняў новых кніг, з іх 60 працэнтаў — першыя выданні. Значыць, кніга патрэбна.

Магчыма, тыражы скарачаюцца, прызнаў старшыня Выдавецкага савета РПЦ, але агульная колькасць кніг, па яго словах, не становіцца меншай. Ён спаслаўся на інфармацыю ад кампетэнтных крыніц: сумарны тыраж традыцыйных кніг, якія з'явіліся ў Расіі ў 2018 годзе, павялічыўся на пяць-шэсць працэнтаў у параўнанні з 2015—2016 гадамі.

— Мэта гэтай выстаўкі — пазнаёміць чытача з новай літаратурай, — удакладніў мітрапаліт Клімент. — Тут прадстаўленая прадукцыя апошніх двух гадоў ад розных выдавецтваў. Тут людзі знойдуць цікавую для іх кнігу і службовай тэматыкі, і багаслоўскай, а таксама мастацкую літаратуру і дзіцячую. Мы да праваслаўнай кнігі адносім не толькі Евангелле, пісанні святых айцоў, але таксама і мастацкую літаратуру, якая адкрывае чалавеку сэнс жыцця.

Праваслаўная кніжная выстаўка-форум «Радасць Слова» — асветніцкі праект Выдавецкага савета РПЦ, які па благаслаўленні Маскоўскага Патрыярха рэалізуецца больш за восем гадоў у розных гарадах і краінах. У Беларусі яна праходзіць упершыню, сярод яе арганізатараў таксама Беларуская праваслаўная царква, асацыяцыя «Праваслаўная кніга», Дом Масквы ў Мінску пры падтрымцы пасольства Расійскай Федэрацыі.

Акрамя ўласна выстаўкі кніг, у рамках форуму пройшлі канферэнцыя на тэму «Подзвіг новапакутнікаў», семінар, прысвечаны пытанням узаемадзеяння царкоўнай і дзяржаўнай бібліятэчных сістэм, сустрэчы з праваслаўнымі пісьменнікамі. Экспануюцца таксама фатаграфіі XIX—XXI стагоддзяў са святой гары Афон (Грэцыя).

Выстаўка працуе два дні — па 17 кастрычніка, з 10 да 19 гадзін. Уваход вольны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Эканоміка адукацыі

# Новыя ўмовы для дзіцячых садкоў

**Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання дзяржаўных устаноў дашкольнай адукацыі будзе рэалізаваны ў Беларусі ў 2020 годзе. Адпаведнае рашэнне прынята з мэтай удасканалення бюджэтнага фінансавання ў галіне адукацыі і занатавана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 кастрычніка 2019 года № 698.**

Эксперымент распаўсюдзіцца на дашкольныя ўстановы адукацыі, якія знаходзяцца на тэрыторыі Гродзенскай вобласці, у Салігорскім раёне, Баранавічах, Віцебску, Гомелі, Магілёве і Першамайскім раёне сталіцы.

Вызначана, што ў 2020 годзе базавы нарматыў для выхаванцаў устаноў дашкольнай адукацыі, размешчаных у гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, складзе 2277,97 рубля ў год, у сельскіх населеных пунктах — 2839,87 рубля ў год. Таксама дакументам устаноўлены карэктуючыя каэфіцыенты, якія прымяняюцца да базавага нарматыву бюджэтнай забяспечанасці расходаў на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца. Яны ўлічваюць шмат акалічнасцяў: працягласць знаходжання выхаванца ў дашкольнай установе, тып установы (напрыклад, калі размова ідзе пра санаторны дзіцячы садок ці санаторную групу), колькасць жыхароў у населеным пункце, дзе функцыянуе дзіцячы садок.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права павялічыць аб'ёмы фінансавання пры наяўнасці крыніц кампенсацыі выдаткаў.

Адказныя за рэалізацыю і маніторынг эксперымента — аблвыканкамы і Мінгарвыканкам. Да 1 лютага 2021 года ўрад чакае справаздачу ад Міністэрства адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Рэйтынгі

# БДУ — на 25-м месцы

**Брытанскае агенцтва QS апублікавала рэйтынг універсітэтаў краін Еўропы, якія развіваюцца, і Цэнтральнай Азіі (QS EECA). Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заняў у ім 25 месца. У ацэначным спісе адлюстраваны толькі 350 найлепшых ВНУ з больш чым 2900 універсітэтаў гэтага рэгіёна. Такім чынам, пазіцыя БДУ адпавядае ўваходжанню ў 1 % найлепшых універсітэтаў на гэтай тэрыторыі.**

Ацэнка дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў рэйтынгам QS EECA праводзілася па дзевяці крытэрыях: акадэмічная рэпутацыя, рэпутацыя сярод работадаўцаў, суадносіны колькасці студэнтаў і колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу, долі выкладчыкаў з вучонай ступенню, запрошаных выкладчыкаў з іншых краін, замежных студэнтаў. Ацэньваліся таксама эфектыўнасць інтэрнэт-рэсурсаў, колькасць апублікаваных артыкулаў, якія прыпадаюць на аднаго супрацоўніка, частата цытавання навуковых артыкулаў прадстаўнікоў універсітэта.

Найбольш высокія пазіцыі ў рэйтынгу БДУ займае па паказчыках «рэпутацыя сярод акадэмічнай супольнасці і работадаўцаў» і «суадносіны колькасці студэнтаў і колькасці прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага складу». Гэта сведчыць аб высокай якасці выкладання ў БДУ, паколькі ў аснову ацэньвання было пакладзена апытанне міжнародных экспертаў.

З беларускіх устаноў вышэйшай адукацыі ў рэйтынгу прадстаўлены таксама Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (у яго 103-я пазіцыя), БДУІР (158-я пазіцыя) і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (195-ы радок).

Тройку лідараў рэгіянальнага рэйтынга склалі МДУ імя М. В. Ламаносава, Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт і Новасібірскі дзяржаўны ўніверсітэт.

У рэйтынгу ўніверсітэтаў краін Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі ўдзельнічаюць ВНУ Арменіі, Азербайджана, Беларусі, Балгарыі, Босніі і Герцагавіны, Харватыі, Чэхіі, Эстоніі, Венгрыі, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Румыніі, Расіі, Сербіі, Славакіі, Славеніі, Турцыі і Украіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## У вадаёмы — больш за шэсць тон рыбы

**Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» (БТПР) правяло зарыбленне адразу пяці вадаёмаў краіны, агульная вага выпушчанай рыбы склала больш за шэсць тон.**

Два вадаёмы размешчаны ў Брэсцкай вобласці. У возера Арэхаўскае ў Маларыцкім раёне выпушчана каля 7 тысяч асобін карпа вагой больш за 2,7 тоны. У найбліжэйшыя дні ў гэты ж вадаём плануецца дадаткова ўсяліць 2,2 тоны шчупака. Амаль 2 тысячы асобін шчупака і карпа было выпушчана ў кар'ер Булькава ў Жабінкаўскім раёне.

Выключна драпежнымі відамі зарыблена Полацкае вадасховішча: туды выпушчана амаль 4 тысячы асобін шчупака і каля 3 тысяч асобін сома. Праведзена зарыбленне двух вадаёмаў у Магілёўскай вобласці. Больш за 2,4 тысячы асобін шчупака, карпа і белага амура выпушчана ў сажалку гарадскога пасёлка Хоцімск. А ў сажалку каля населенага пункта Тупічына Касцюковіцкага раёна выпусцілі больш за адну тысячу асобін шчупака, карпа і белага амура.

Зарыбленне вадаёмаў праводзіцца за кошт сродкаў Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, атрыманых ад выплаты членскіх узносаў рыбаловамі-аматарамі.

## Ключ ад дзвярэй у кошыку...

### Ім і скарыстаўся няпрошаны госць

**У Буда-Кашалёўскі РАУС звярнулася 63-гадовая гамяльчанка. Яна паведаміла, што невядомы ўкраў з дачнага дома ў вёсцы Шырокае грошы, больш за 300 рублёў.**

Супрацоўнікі міліцыі высветлілі, што зладзей увайшоў у памяшканне дачы, скарыстаўшыся ключом, які гаспадыня захоўвала ў кошыку побач з дзвярыма. З жаночай сумачкі прапала 300 рублёў. Знік і магніты трымальнік для манет, што ляжаў на халадзільніку.

Аператыўнікі хутка вылічылі, хто можа быць датычны да здзяйснення крадзяжу. Неўзабаве 35-гадовая жыхарка гэтай жа вёскі не толькі расказала, як пранікла ў хату, але і вярнула большую частку грошай. Астатняе паспела патрацідь на прадукты харчавання і цыгарэты, паведамілі ў УУС Гомельскага аблвыканкама.

Сышчыкі правяраюць падазраваную, якая цяпер затрыманая, на датычнасць да здзяйснення аналагічных крадзяжоў, у тым ліку на тэрыторыі іншых раёнаў Гомельшчыны.

## Украў грошы медработнікаў

### А тыя потым аказвалі дапамогу зладзюжку ў наркалогіі

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС сталіцы затрыманы 28-гадовы малады чалавек, які, знаходзячыся пад уздзеяннем наркатычных сродкаў, скраў грошы медыцынскага персаналу адной з бальніц Мінска.**

На прапускным пункце медустановы мужчына прадставіўся сваяком аднаго з пацыентаў. Пасля гэтага, пранікаючы ў пакоі медыцынскага персаналу бальніцы, пачынаючы з другога паверха і заканчваючы дванаццатым, ён выцягваў з сумак грашовыя сродкі. Усяго зламыснік здолеў украсці каля 490 рублёў. Аператыўнікі затрымалі злодзея на выхадзе з бальніцы, а грашовыя сродкі вярнулі ўладальнікам.

У момант здзяйснення крадзяжоў малады чалавек знаходзіўся пад уздзеяннем наркатычных сродкаў і быў шпіталізаваны ў таксікалагічнае аддзяленне гэтай жа бальніцы ў стане наркатычнага ап'янення, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Вядома, што мужчына нідзе не працуе. Раней ён прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзяжы і незаконны абарот наркотыкаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ВОЧЫ НІКОЛІ НЕ СХЛУСЯЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У канферэнцыі прыняло ўдзел каля 60 прадстаўнікоў буйных музеяў, цэнтральных банкаў, вядучыя навукоўцы-нумізматы, даследчыкі гісторыі грашовага абарачэння, банкаўскай справы і сучасная манетнай чаканкі з сямі краін: Беларусі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Славакіі і Украіны.

## НОВЫЯ КУПЮРЫ Ў 20 І 50 РУБЛЁЎ

Падчас адкрыцця канферэнцыі **намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый ЛАПКО** заявіў, што банк сочыць за тэндэнцыямі ў галіне абароны грашовых знакаў, выкарыстання сучасных матэрыялаў, якія патрэбныя пры іх вырабе, і праводзіць мерапрыемствы па далейшым удасканаленні наяўных грошай. Нацыянальным банкам анансаваны выпуск у абарачэнне ў 2020 годзе абноўленых банкнотаў наміналам 20 і 50 рублёў.

Намеснік старшыні Нацбанка нагадаў, што абноўленыя банкноты наміналам 5 і 10 рублёў уведзены ў абарачэнне сёлета з 20 мая. Яны распрацаваны на аснове пяці- і дзесяцірублёвых банкнотаў, якія знаходзяцца ў абарачэнні з 2016 года. З улікам патрабаванняў часу ў дызайн банкнотаў былі ўнесены змяненні. У прыватнасці, у адпаведнасць з актуальным знешнім выглядам прыведзены выявы архітэктурных збудаванняў на баках банкнотаў. У асветніцкіх мэтах на банкнотах пазначаны назвы гэтых збудаванняў.

Міжнародная нумізматычная канферэнцыя праводзіцца Нацыянальным банкам пры садзейнічанні Беларускага нумізматычнага таварыства раз на два гады і з'яўляецца значнай падзеяй у нумізматычным руху Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Першая канферэнцыя адбылася ў 2003 годзе.

Ахоўны комплекс банкнотаў узору 2009 года распрацоўваўся больш за дзесяць гадоў таму, у сувязі з чым патрабаваліся яго аптымізацыя і ўзмацненне. Змяненні закранулі вадзяны знак, ахоўную нітку, схаваны малюнак і асобныя машыначытальныя ахоўныя элементы. Для павелічэння зносаўстойлівасці і падаўжэння тэрміну жыцця банкнотаў выкарыстана двухбаковае лакіраванне і ўмацаванне контуру банкнотаў па перыметры.

## НАШЫ ГРОШЫ НА ПОГЛЯД СУСЕДЗЯЎ

**Збышак ШУСТЭК, супрацоўнік Гістарычнага інстытута Славацкай акадэміі навук, старшыня Славацкага нумізматычнага таварыства** падзяліўся сваім асабістым меркаваннем пра беларускія грошы, якія ў нас у абарачэнні з 2016 года. Як дасведчаны нумізмат ён задаўся пытаннем: што на папяровых грашах павінна быць намалявана, каб апрыёры абараніць іх ад падробкі? Многія спецыялісты ўпэўненыя, што на купюрах павінны быць выразныя чалавечыя твары. Чаму?



Збышак ШУСТЭК.

Наш эксперт лічыць, што ў людзей са старажытнасці захавалася форма невербальнай камунікацыі. Яна вельмі дакладна звязана з тым, як мы глядзім адзін аднаму ў вочы. Лічылася, што па адным поглядзе ў іх можна ўсё даведацца пра чалавека, таму падрабіць такія грошыкі, дзе трэба перадаць унутраную сілу погляду, практычна немагчыма. Калі на банкноце намаляваны будынак ці які-небудзь іншы прадмет, то можна не заўважыць нават сур'ёзны недахоп у падробцы. Недахоп на тварах чалавека выявіць (адчуе) амаль любы карыстальнік.

«На жаль, на еўрапейскіх грашах, гэтак жа як і на беларускіх, чалавечыя асобы адсутнічаюць. У вас будынкі, іншыя архітэктурныя збудаванні, знакавыя прадметы побыту... Так, гэта мае вялікі ўплыў на пэўную падтрымку нацыянальных і дзяржаўных традыцый, самабытнасці і самавызначэння. Бо гэтыя будынкі, якія нанесены на беларускіх грашах, вельмі моцна звязаны з вашай гісторыяй. Гэта вельмі важна. Але чамусьці на вашых грашах адсутнічаюць асобы знакамітых людзей...

А беларуская культура і гісторыя дастаткова багатая на менавіта знакавых людзей. Больш за тое, у вас ёсць асобы, аўтарытэт якіх дастаткова высокі, і ён ужо бясспрэчны.

Абязлічаная еўрапейская валюта стала такой, таму што вельмі складана адшукаць асоб, якія задаволілі б літаральна ўсіх жыхароў краін Еўропы. А Беларусь адносна невялікая дзяржава з адзінымі традыцыямі і ладам жыцця».

Гаворачы пра манеты, Збышак Шустэк адзначыў, што Нацыянальны банк нашай краіны мае групу выдатных мастакоў. Гэта відаць са шматлікай эмісіі памятных манет, якія адрозніваюцца цікавай разнастайнасцю, выдатным стылем і высокай якасцю чаканкі.

«А вашы звычайныя манеты вельмі, вельмі простыя. Няважна, што там нейкі складаны арнамент. Мне здаецца, што не вельмі добра, калі вашы манеты па сваіх тэхнічных параметрах падобныя на манеты еўра. Можа, хто скажа, што мы, бадай, у адной мясцовасці жывём, амаль што адна сям'я. Але, на думку многіх спецыялістаў, манеты еўра няўдалыя.

Напрыклад, чэшскія эксперты параўноўвалі тры серыі манет — славацкія, чэшскія і еўра. Далі іх людзям і папрасілі на хуткасць скласці пэўную суму грошай. Лягчэй за ўсіх справіліся з задачай эксперыментатары са славацкімі грашыма, потым з чэшскімі, і больш за ўсё праблем было з еўра. Гэта звязана з тым, што ўсе дробныя еўра-цэнты візуальна вельмі падобныя. Вашы манеты наміналам 2 капейкі і 10 капеек, і з другога боку 20 капеек і 50 капеек таксама вельмі лёгка можна зблытаць. І трэба быць вельмі ўважлівым, каб не памыліцца...»

## ЕЎРАПЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ ЎЖО І НА МАНЕТАХ

Асаблівую ўвагу Нацыянальны банк аддае развіццю нумізматычнага рынку і выпуску ў абарачэнне памятных манет. Яны аб'яднаны ў чатырох асноўных тэматыках: «Беларусь і сусветная супольнасць», «Гісторыя і культура Беларусі», «Спорт» і «Абарона навакольнага асяроддзя».

Сёлета выпушчаны ў абарачэнне памятныя манеты, прысвечаныя праведзеным у краіне II Еўрапейскім гульням. Працягнутыя серыі манет прыродаахоўнай тэматыкі — «Заказнікі Беларусі» і «Птушка года». Падарункавы сегмент прадстаўлены манетай серыі «Кітайскі каляндар» і памятнымі манетамі «Дзень анёла». Нараўне з выпускам манет у гонар 1000-годдзя з дня заснавання Брэста працягнуты выпуск, прысвечаны юбілеям выдатных асоб, напрыклад 200-годдзю з дня нараджэння беларускага кампазітара Станіслава Манюшкі. Дасягненні беларускіх спартсменаў будуць адзначаны выпускам манет, прысвечаных тэнісу.

Пералік памятных манет на 2020 год зараз фарміруецца. Плануецца выпуск манет, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння беларускага жывапісца Фердынанда Рушчыца, і памятнай манеты, прысвечанай аднаму з кірункаў выяўленчага мастацтва — авангарду.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Не прапусці!

# Бульба «фестываліць»

**Фестываль-кірмаш «Беларуская восень. Бульба. Плады. Гародніна» пройдзе 19 кастрычніка на базе Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве (Мінская вобласць, аграгарадок Самахвалавічы, вуліца Кавалёва, 2а).**



У мерапрыемстве возьмуць удзел вучоныя-селекцыянеры Акадэміі навук, прадстаўнікі фермерскіх гаспадарак, індывідуальныя прадпрымальнікі краіны. У рамках фестывалю будзе арганізавана выстаўка дасягненняў вучоных у галіне бульбаводства, пладаводства і агародніцтва, будуць дэманстравацца новыя сарты бульбы беларускай селекцыі, тэхналогіі вырошчвання раслін, адбудзецца выстаўка-продаж прадуктаў перапрацоўкі пладоў і ягад.

Наведвальнікаў фестывалю ўразіць гіганцкая патэльня, на якой гаспадары будуць гатаваць бульбу і частаваць гасцей свята. У праграме таксама — дэгустацыя традыцыйных і арыгінальных страў беларускай кухні, продаж бульбы і плодаагароднінная прадукцыі, забаўляльная праграма, выступленне народнага ансамбля, правядзенне конкурсаў і ўзнагароджанне пераможцаў памятнымі прызамі. Урачыстае адкрыццё свята адбудзецца ў 10.00.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона 19.11.2019**

Лот № 1: **капитальное строение с инв. № 700/С-105225 – асфальтовое покрытие № 3**, площадь – 530,1 кв. м, назначение: сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. Составные части и принадлежности: сооружение: асфальтовое покрытие № 3. **Капитальное строение с инв. № 700/С-105222 – ограждение № 3,** площадь – 48,8 кв. м, назначение: сооружение неустановленного назначения. Составные части и принадлежности: сооружение: ограждение № 3, состоящее из четырех ограждений, ворот. Лот № 1 расположен по адресу: г. Могилев, пер. Базный, пер. Товарный, пер. Владимирова, территория ОАО «Агросервис», на земельном участке с кадастровым номером 740100000002006854 (площадь – 0,1273 га, доля 67/100, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданий гаражей, склада и сооружений, адрес: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Товарный, 8, предоставлен на праве аренды, ограничение: природоохранная территория). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен.
Начальная цена продажи: 13 700,00 бел. рублей с учетом НДС (20 %).
Сумма задатка: 1 370,00 белорусских рублей

**Аукцион состоится 19 ноября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (осуществляется лично) и внесения задатка: 18 ноября 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

**Продавец**: ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а, тел. 73-57-84

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно лично подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.
**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by, на сайте ino.by**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ**

**УП «Могилевское отделение БелТПП» 19 ноября 2019 в 12.00 проводит торги по продаже следующих объектов**

**Лот № 1:** капитальное строение с инвентарным номером 710/С-69984 (назначение – здание специализированное иного назначения; наименование – производственное здание), общей площадью – 269,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, пер. Затонный, 2А.
**Начальная цена продажи с учетом НДС:** 46 800 руб. 00 коп. (сорок шесть тысяч восемьсот белорусских рублей 00 копеек), задаток – 4680 бел. руб. 00 коп. (четыре тысячи шестьсот восемьдесят белорусских рубля 00 копеек).
**Собственник имущества:** Республиканское государственно-общественное объединение «Белорусское республиканское общество спасания на водах» (ОСВОД), 220004, г. Минск, пер. Обойный, д. 6.
**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1, сайт: www.mogilevcci.by.
**Место проведения торгов:** г. Бобруйск, ул. Советская, 48, Бобруйский филиал УП «Могилевское отделение БелТПП».
Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены, с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых УП «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».
Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.
**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.
Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.
Торги состоятся 19 ноября 2019 г. в 12.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Советская, 48, Бобруйский филиал УП «Могилевское отделение БелТПП».
Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 18 ноября 2019 до 12.00.
Регистрация участников торгов 19 ноября 2019 с 11.00 до 12.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Советская, 48, Бобруйский филиал УП «Могилевское отделение БелТПП».
Телефоны для справок: (0222) 778042, +375 033 6276659 (МТС), + 375 0296927492 (Velcom).
Дополнительная информация размещена на сайте организатора в разделе «торги» по адресу: **www.mogilevcci.by.**

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 18 (15873)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года




Імёны

## Вольга САЦЮК:
# «МУЗЫКУ Я НЕ КІНУ»

**Маладая, амбіцыйная, прыгожая і, безумоўна, таленавітая, яна ўжо не раз даказвала ўсім навакол і, вядома ж, самой сабе, што без намаганняў і працы не дабіцца поспеху. Яе галоўнае жыццёвае правіла — ніколі не шкадаваць пра мінулае, а ўпэўнена і мэтанакіравана існаваць у сучаснасці!**

**— Вольга, давайце пагаворым аб пачатку вашай кар'еры — дзіцячым «Еўрабачанні»... Скажыце, ці не хацелася б прадставіць Беларусь цяпер, калі для стварэння нумара існуе так шмат розных тэхнічных сродкаў?**

— На самай справе не асабліва люблю так разважаць — «як магло б быць». Я вучуся жыць у цяперашнім часе, з усімі яго шанцамі і разнастайнасцю! Але, калі казаць пра першыя... Цяпер яшчэ да конкурсу ёсць магчымасць пазнаёміць выступоўцу з гледачом праз сацыяльныя сеткі, можна ўдзельнічаць у розных акцыях, канцэртах і фестывалях. А пра тое, як можна было ўпрыгожыць сваё выступленне 15 гадоў таму, каб усіх здзівіць, мы можам разважаць толькі з пункту гледжання таго часу. Ужо з 2004 года канкурсанты маюць цэлыя каманды, у якія ўваходзяць фаніятр, харэограф, педагог-вакаліст, піяр-менеджар... На той момант, вядома, пра гэта не думала, нават не ведала, што так лепш і ўвогуле магчыма. Я была дзіцем, якому паставілі задачу годна выступіць у прамым эфіры на вялікую аўдыторыю і прадставіць сваю краіну. Хочацца думаць, што я з ёй справілася.

**— Вы сталі папулярнай вельмі рана. Ці ўдалося пазбегнуць «зорнай хваробы»?**

— Калі я прыехала з «Еўрабачання», мне было ўсяго дзесяць гадоў, адразу ж пасля конкурсу сталі паступаць прапановы: паўдзельнічаць у розных творчых спаборніцтвах міжнароднага фармату, фестывалях, стаць тэлевядучай. Мне пашчасціла весці такія праграмы, як «Сузор'е надзей», «Вас выклікае Спартландыя!», нацыянальны адбор Junior Eurovision Song Contest і дзіцячы конкурс у рамках «Славянскага базару ў Віцебску». Для малой усё гэта было як творчы «Дыснейлэнд». Насамрэч магла з'явіцца тая самая «хвароба», але мне вельмі пашанцавала са сваёй сям'ёй. Яна заўсёды падтрымлівала, дапамагала, давала парады, трымала эмацыянальны ўдар і літаральна жыла маім жыццём.

**— Пасталеўшы, вы не кінулі займацца музыкай, а, наадварот, пайшлі атрымліваць адпаведную адукацыю...**

— Я ведала, што гэта маё і што жыццё будзе звязана з музыкай. Пасля школы паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў на спецыяльнасць «саліст-вакаліст» завочнага аддзялення. На дзённае вырашыла не ісці, бо рэдка сяджу на месцы і магу папросту сарваць, атрымаўшы прапанову выступіць у іншай краіне, паехаць на фестываль ці быць на здымках. Не магла сабе ўявіць, як часта прыйшлося б прасіць мяне «зразумець і дараваць», дакладней не мяне, а ўсе мае прагулы і просьбы аб здачы датэрміновага іспыту або ўсёй сесіі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

У нагу з часам

# ВЯСКОВАЯ РОБАТАТЭХНІКА

## Неперспектыўныя? Гэта не пра іх...

**«Прывітанне! Я Лёня — праграміст, вучань невялікай сельскай школы. Мы вельмі часта чуем аб праграмаванні і самі спрабуем ствараць гульні ў праграме Scratch. У нас нават ёсць перамогі на розных конкурсах. Я вельмі хачу вучыцца і далей. Многія мае аднакласнікі мараць стаць праграмістамі і займацца робататэхнікай. Па тэлебачанні мы бачым, як навучэнцы з вялікіх школ ствараюць робатаў з LEGO, а потым іх праграмуюць. Наша вялікая мара — мець такі ж LEGO-набор. Але, на жаль, у школы няма грошай для яго набыцця. Калі ў вашай кампаніі яны ёсць, не маглі б вы падарыць нам адзін такі LEGO-канструктар. У будучым мы станем праграмістамі і таксама будзем рабіць добрыя справы.**

**З надыходзячым вас Новым годам і Раством! Прыязджайце да нас у госці! У нас ёсць смачныя яблыкі.**

**Лёня-праграміст, 8 гадоў. Я жыву ў вёсцы Рассвет. Вучуся ў Рассветаўскай сярэдняй школе Клецкага раёна Мінскай вобласці».**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Свая вышыня

# Цуды ў паветры

## Яны здараюцца, калі «закальцаваць» хобі і работу



**Ніколі не ведаеш, куды прывядзе цябе жыццё. Днём ты можаш працаваць у офісе, а вечарам — скараць новыя нязведаныя вяршыні... Менавіта так жыве Яна МАКАВЕЦ, трэнер па такім незвычайным відзе спорту, як «паветранае кальцо» ў сталічнай студыі танца Вольгі Рэпінай.**

**— Як вы прыйшлі да гэтага занятку?**

— Спорт даўно стаў неад'емнай часткай майго жыцця. Усё пачалося яшчэ ў апошніх класах школы, калі я стала захапляцца сучаснай харэаграфіяй. Далей захацелася чагосьці большага, і я змяніла сваю першую школу танца на студыю Вольгі Рэпінай. Тут усё і закруцілася з падвоенай сілай: новыя стылі, эмоцыі, снарады... У нашай зале заняткі праходзілі па двух кірунках: харэаграфія і даволі рэдкі ў той час pole dance. Год я хадзіла толькі танцаваць, перыядычна пазіраючы на эфектныя трукі дзяўчат на пілоне. Пасля вырашыла — хачу! Праз некалькі гадоў у студыі з'явіўся новы снарад — паветранае кальцо. І ў маім жыцці зноў усё паўтарылася — да двух ужо наяўных кірункаў дадаўся яшчэ адзін.

**— Вы пачыналі вучаніцай, а цяпер самі выкладаеце...**

— Па збегу абставін папярэдні трэнер па паветраным кальцы больш не змог выкладаць, і гэтую пасаду прапанавалі мне. Было вельмі хвалююча, але ў той жа час надзвычай радасна. Да пачатку маёй трэнерскай дзейнасці быў складаны, але вельмі цікавы перыяд своеасаблівай «перадачы спраў». Далей знаёмства з групамі і маса станоўчых эмоцый. Ну а потым і асноўная работа трэнера. І, ведаеце, гэта зацягвае *(смяецца)*.

**— Паветранае кальцо — небяспечны кірунак?**

— Першапачаткова гэта ўсё ж цыркавы снарад. Таму, так, яго можна лічыць небяспечным. Аднак, калі прытрымлівацца тэхнікі бяспекі, слухаць указанні і не спяшацца, нічога страшнага не здарыцца. На занятках трэнер заўсёды побач, ён дапаможа, падстрахуе і падтрымае пры неабходнасці.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

# ВЯСКОВАЯ РОБАТАТЭХНІКА

### Пуцяводны «Меркурый»

Такі ліст напрыканцы мінулага года атрымалі каля ста IT-кампаній. Іх адрасы другакласнік Лёня разам са сваімі сябрамі знайшоў на сайце ПВТ. «Наіўны хлопчык, які верыць у цуды», — падумалі зараз многія з вас. І дарэмна. Можа быць, адыгралі сваю ролю навагоднія святы, калі хочацца зрабіць штосьці добрае, абавязкова кагосьці парадаваць, а, можа, наіўнасць хлопчыка кранула сэрцы дарослых. Але яго просьба не засталася незаўважанай: у школу сталі тэлефанаваць і пытацца ў кіраўніцтва, чым канкрэтна могуць дапамагчы. У красавіку ў навучальнай установе адкрыўся клас, аснашчаны сучаснай тэхнікай для заняткаў робататэхнікай і праграмаваннем. Больш за тое, Рассветаўская школа займела такога надзейнага сябра, як дырэктар кампаніі Vizor Games Сяргей БРУЙ. А ў пачатку кастрычніка ў невялікай сельскай установе адукацыі, дзе навучаюцца ўсяго 85 чалавек, адкрыўся STEM-цэнтр, якому могуць пазайздросціць нават самыя крутыя гарадскія школы. З'явіўся ён дзякуючы спонсарскай падтрымцы кампаніі Vizor Games. «Чаму пашанцавала менавіта ім?» — можа нехта падумаць. Але калі размаўляеш з **дырэктарам школы Сяргеем ДУБМАНАМ**, то пераконваешся, што нічога выпадковага не бывае...

— Колькі гадоў таму мы з нашымі вучнямі прыехалі ў горад, каб паўдзельнічаць у нейкім конкурсе. І пачулі: «Вёска прыехала», — расказвае Сяргей Леанідавіч. — Шчыра скажу: такая ацэнка мяне моцна зачапіла. А ў чым нашы вучні горшыя за гарадскіх? Падумаў і вырашыў — трэба развіваць інфармацыйныя тэхналогіі, каб ні ў чым не саступаць, бо на «Карветах» і «Нямігах» далёка не паедзеш. Але дзе ўзяць грошы? Так у нас з'явілася школьная бізнес-кампанія «Меркурый». Пачалі вязаць венікі і прадаваць іх калгасу (там яны шмат дзе патрэбныя). Задзейнічаны былі ўсе: ад малодшых да старэйшых школьнікаў. Усе працавалі на адну агульную мэту — стаць найлепшымі! Затым пачалі вырошчваць сельскагаспадарчую прадукцыю. У нас у пасёлку шмат немаладых людзей, яны саступалі нам свае ўчасткі, таму што ўжо не было сіл іх апрацоўваць. Мы з удзячнасцю забіралі, а ўзамен забяспечвалі іх неабходнай гароднінай на зіму. Сёння вырошчваем бульбу, моркву, буракі, капусту, цыбулю, таматы, яблыкі, расаду гародніны, кветак і пакаёвых раслін. Сельгаспрадукцыю ў нас закупляюць аздараўленчы летнік, дзіцячы садзік, бальніца. У школы ёсць свой конь, а гэта добрая дапамога па гаспадарцы. Займаемся таксама вытворчасцю дэкаратыўных альтанак, лавак, арак, агароджаў. Ствараем і рэалізуем відэапрадукцыю.

За час існавання бізнес-кампаніі было зароблена больш як дзесяць тысяч рублёў. Сродкі ўкладвалі ў тэхнічнае аснашчэнне школы. Пасля першых перамог на розных конкурсах у дзяцей узнялася самаацэнка. Потым нам стала мала двух-трох-пяці дыпломаў, мы бачылі, што нашы вучні здольныя на большае, пачалі ўдзельнічаць у іншых конкурсах: «Энергамарафон», «Энергія і асяроддзе пражывання», «Тэхнаінтэлект», «100 ідэй для Беларусі», Турніры юных фізікаў і г. д. Некаторыя з іх прыносілі нам не толькі дыпломы пераможцаў, прызёраў і лаўрэатаў, але і грашовыя бонусы. У міжнародным конкурсе «Зялёны сад» прыз склаў 400 рублёў, міжнародным конкурсе школьных праектаў выкарыстання рэсурсаў і энергіі «ШПІРЭ» — 200 еўра. Таксама мы сабралі пяць тысяч шкляных бутэлек, здалі іх і занялі першае месца ў краіне ў конкурсе па зборы другаснай сыравіны. Нам выдзелілі грошы, за якія набылі для школы відэакамеру. Сталі ствараць відэафільмы, удзельнічаць у розных конкурсах і зарабляць на гэтым. Збіралі макулатуру і металалом. Калі купілі ноўтбукі, змаглі ўдзельнічаць ужо у тэхнічных конкурсах, выходзіць на рэспубліканскі і міжнародны ўзровень.

Заўважу, што ў нашу школу падвозяць дзяцей амаль з дзесяці навакольных вёсак. Ёсць і дзеці з Клецка, сваіх з пасёлка Рассвет — толькі пятнаццаць. 90 працэнтаў бацькоў нашых вучняў працуюць на сельгаспрадпрыемствах. Ужо дзесяць гадоў запар мы застаёмся найлепшай школай у раёне. І гэта не выхвальства, а ацэнка работы нашых вучняў і іх педагогаў. У бягучым годзе мы занялі другое месца ў Мінскай вобласці сярод усіх школ. Да гэтага займалі першыя месцы па эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці, што таксама, лічу, немалаважна. Нас ведаюць у краіне, мэта дасягнутая. І калі мы прыязджаем цяпер на нейкі конкурс, тут жа ідзе пагалоска: «Рассвет прыехаў...» З намі сталі лічыцца, мы паказалі і даказалі ўсім, што сельскія дзеці нават з не вельмі забяспечаных сем'яў пры стварэнні пэўнага адукацыйнага асяроддзя могуць дабіцца вялікага поспеху.



Жэня Бурак, Лёня Фурман і Ксенія Буката: «Калі першыя робаты ажылі ў нашых руках, мы былі ў захапленні».

**STEM-цэнтры — класы, адкрытыя на базе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, дзе дзеці пад кіраўніцтвам спецыяльна падрыхтаваных педагогаў могуць бясплатна займацца па асноўных STEM-кірунках. Абрэвіятура STEM расшыфроўваецца наступным чынам: S — science (навука), T — technologies (тэхналогіі), E — engineering (інжынерыя), M — mathematics (матэматыка).**

**У STEM-класе дапытлівыя і таленавітыя дзеці могуць адкрываць для сябе займальны свет праграмавання, робататэхнікі, вучыцца 3D-мадэляванню і іншым навыкам, без якіх хутка складана будзе ўявіць сабе жыццё ў сучасным грамадстве.**




Наталля Раманоўская і Уладзіслаў Бабіч. Без фанатаў-педагогаў нават самае сучаснае тэхнічнае напаўненне пазбаўлена сэнсу.

З шасці выпускнікоў бягучага года пяцёра паступілі ў ВНУ. Мы ў год заваёўваем на інтэлектуальных конкурсах да ста дыпломаў (на абласным, рэспубліканскім і міжнародным узроўнях).

### Таму што Лёня не здаўся!

Дырэктар Рассветаўскай школы прызнаецца, што яшчэ год таму меў вельмі цьмянае ўяўленне пра робатаў і робататэхніку. Затое цяпер, дзякуючы сваім вучням, стаў вельмі «прасунутым» у гэтым пытанні:

— Наш другакласнік Лёня Фурман, якому прыйшла ідэя напісаць ліст у IT-кампаніі, займаўся ў школьным гуртку Scratch-праграмаваннем. І вось ён загарэўся ідэяй: хачу, кажа, сабраць робата, які дапаможа аблегчыць працу маці (яна працуе раздатчыцай на свінакомплексе), бо ў яе рукі вельмі баляць, — расказвае Сяргей Дубман. — Прыходзіць да мяне і кажа: «Сяргей Леанідавіч, давайце купім робата». Я ў адказ: «Якога робата?» Малы адзін раз падыходзіць з гэтым пытаннем, другі. Я зноў кажу: «Грошай няма. Усё, што было зароблена, уклалі ў ноўтбукі, тэлевізары і медыяпраектары». У нас у школе ёсць вай-фай, таму ўся тэхніка можа быць задзейнічана на ўроку. Але Лёня не здаўся. Гляджу — сядзяць мае вучні і штосьці абмяркоўваюць. Пацікавіўся, бо я ж павінен быць у курсе ўсіх спраў *(смяецца)*. Аказалася, «пішуць ліст турэцкаму султану»... Падключылі старэйшых, каб тыя выправілі памылкі. Малыя знайшлі адрасы кампаній на сайце ПВТ. Але ніхто не чакаў, што будзе такі эфект. Я думаю, што па суме укладзеных сродкаў з разліку на колькасць вучняў цяпер нашай школе роўных няма *(смяецца)*. А калі кампанія Vizor Games падтрымала нас адкрыццём STEM-цэнтра, мы ўвогуле былі на сёмым небе...

Па словах Сяргея Дубмана, за межамі Мінска пра STEM-рух чулі не многія. Яшчэ менш людзей разумеюць, навошта дзецям займацца робататэхнікай: «Таму мы загарэліся ідэяй стварыць STEM-цэнтр, які будзе служыць усяму раёну. У маі правялі першы раённы робафестываль, куды запрасілі каля сотні дзяцей з іх бацькамі, каб тыя пабачылі магчымасці робататэхнікі».

Сёння ў Рассветаўскай школе ёсць два маладыя апантаныя педагогі, гатовыя ўвесь свой час траціць на дзяцей. **Наталля РАМАНОЎСКАЯ** працуе ў пасёлку ўжо чацвёрты год. Яе галоўная спецыялізацыя — педагог-псіхолаг, але пасля заканчэння курсаў яна стала таксама выкладаць дзецям Scratch-праграмаванне. Да яе далучыўся малады настаўнік гісторыі **Уладзіслаў БАБІЧ** (у школе ён ужо трэці год і сцвярджае, што ўсё яго задавальняе). Пад яго кіраўніцтвам дзеці асвойваюць азы робататэхнікі і Lego-канструявання. Заняткамі ў гуртках і на факультатывах ахоплены практычна ўсе вучні школы. Дарэчы, на Рэспубліканскім конкурсе па Scratch-праграмаванні школьнікі з пасёлка Рассвет атрымалі ў якасці прыза дрон. Цяпер ён задзейнічаны ў здымках фільмаў, якія ствараюцца ў школьным відэацэнтры.

### Каб падхапілі эстафету...

Але STEM-цэнтр — гэта якасна новы ўзровень, і трэба па максімуме рэалізаваць яго адукацыйны патэнцыял. Двое педагогаў-энтузіястаў могуць задаволіць патрэбы вучняў сваёй школы, але не ўсяго раёна, бо ў іх ёсць шмат абавязкаў: трэба рыхтавацца да ўрокаў, займацца класным кіраўніцтвам, пісаць справаздачы....

Кадравая праблема стаіць зараз найбольш востра.

— Як мы збіраемся яе вырашаць? Па суботах пачалі прымаць дзяцей з іншых школ. Яны прыязджаюць разам са сваімі настаўнікамі. Ствараем магчымасці для ўзаемнага навучання і прасоўваем ідэі STEM-адукацыі, — разважае Сяргей Дубман. — За месяц атрымліваецца восем гадзін. За гэты час можна даць толькі базавыя веды, агульнае ўяўленне, што такое робататэхніка. Мы гэта разумеем. Але калі будзе інтарэс, то педагогі могуць падхапіць эстафету ў нашых настаўнікаў... За месяц праз STEM-цэнтр можа прайсці каля 80 вучняў з іншых навучальных устаноў нашага раёна, тым больш што ў нас ёсць свае школьныя аўтобусы. Будзем праводзіць для іх IT-канікулы. За год можам ахапіць 1100 дзяцей, вучняў і іх бацькоў. Канешне, усе айцішнікамі не стануць, але мы заўважылі, што робататэхніка і праграмаванне даюць развіццё і па іншых прадметах, той жа матэматыцы, англійскай мове. На жаль, са школьнай праграмы ў дзявятым класе прыбралі «чарчэнне»: без гэтых ведаў немагчыма навучыцца «чытаць чарцяжы»...

— А мы і не ставім задачу — зрабіць усіх праграмістамі. Наша мэта — даць школьнікам сучасныя веды і навыкі, якія будуць затым запатрабаваныя ў любой сферы, якую яны выберуць, — канстатуе **дырэктар кампаніі Vizor Games Сяргей БРУЙ,** які прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця STEM-цэнтра ў Рассветаўскай школе. — Насамрэч, праграмістаў у IT-кампаніях працуе няшмат. У нас каля 600 работнікаў, з іх непасрэдна праграмістаў — каля ста. Усе іншыя — гэта мастакі, аналітыкі, адміністратары, спецыялісты ў сферы маркетынгу, сацыяльных праектаў... Сёння мы дапамагаем сельскай школе, сацыяльна-педагагічным цэнтрам, Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы — і гэта цалкам нармальна. Калі я ў 1996 годзе прыйшоў у Мінскі палац дзяцей і моладзі займацца праграмаваннем, там былі добрыя па тым часе камп'ютары, якія хтосьці для нас набыў, плюс выдатныя педагогі. Можа быць, калі Лёня вырасце, ён таксама падхопіць у нас эстафету?

**«Робататэхніка і праграмаванне даюць развіццё і па іншых прадметах».**

Цяпер у распараджэнні вучняў адукацыйнага цэнтра 23 ноўтбукі і 26 канструктараў рознай складанасці, пачынаючы ад найпрацейшых экзэмпляраў, прызначаных для развіцця дробнай маторыкі ў малых, і заканчваючы робатамі са штучным інтэлектам. Ёсць 3D-прынтары, графічныя планшэты, магнітна-маркерныя дошкі...

Школьнікі прадэманстравалі гасцям сабранага ўласнымі рукамі робата-сарціроўшчыка (у шматдзетнай сям'і ён дапамагае раскласці шкарпэткі па парах); робата, які стварае штучны землятрус і можа дапамагчы архітэктарам пры праектаванні дамоў; робата, які падае і змешвае напоі, і іншых.

— Гісторыя з'яўлення STEM-цэнтра ў Рассветаўскай школе не падобная на гісторыі іншых школ, — канстатуе **дырэктар Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні» Аляксандр ХОМІЧ.** — Год таму мы абвясцілі для ўстаноў адукацыі конкурс «Хачу ў STEM-клас», па выніках якога былі абраныя дзесяць пераможцаў. Абзавесціся сучасным STEM-цэнтрам — цалкам рэальна. Пры садзейнічанні вядучых IT-кампаній у гарадскіх і сельскіх школах ужо адкрыліся 15 цэнтраў і шэсць адкрыюцца да канца бягучага года.

У найбліжэйшы час будзе абвешчаны старт трэцяга конкурсу. Стаць яго ўдзельнікам можа любая беларуская школа або гімназія, якая пакуль што не мае STEM-цэнтра, аднак гатовая ісці насустрач тэхналагічнай будучыні. Матывацыя педагогаў для нас вельмі важная, бо без фанатаў-педагогаў нават самае сучаснае тэхнічнае напаўненне пазбаўлена сэнсу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара і кампаніі Vizor Games.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



*Медыяджунглі*

# Бачыць, чуць і разумець

## Як не стаць ахвярай маніпуляцый

**СУСЕДЗІ кажуць, што трэба адмовіцца ад прышчэпак, па тэлебачанні абмяркоўваюць надыход чарговага канца свету... У інтэрнэце пішуць, што кефірная дыета (гандаль на «Форэксе», халатропнае дыханне, прабежкі галышом) назаўжды зробяць цябе шчаслівым... Вакол нас занадта шмат інфармацыі, але як адрозніць праўдзівыя і абгрунтаваныя заявы ад нахабнай маніпуляцыі і шчырага, але не менш небяспечнага глупства?**

**Педагогі з гродзенскай сярэдняй школы № 26 Тацццяна і Сяргей ФАДЗІНЫ** запусцілі для падлеткаў аўтарскі дыстанцыйны курс «Бачу. Чую. Разумею».

— Яго мэта — павышэнне медыяінфармацыйнай кампетэнтнасці падлеткаў, — тлумачыць настаўніца англійскай мовы Таццяна Фадзіна. — Наш курс — гэта частка праграмы па медыяадукацыі, якую рэалізуе Таварыства беларускай школы. Мушу заўважыць, што аналагічнымі праблемамі сёння заклапочаны ва ўсім свеце, але ў большасці краін, як і ў нас, асобнага прадмета «медыяадукацыя» ў школе няма. Таму гэтыя веды інтэгруюцца ў іншыя дысцыпліны. Між іншым, пошук і выкарыстанне інфармацыі пастаянна прысутнічаюць у нашым жыцці. **Сёння мы ўсе знаходзімся ў медыяпалоне круглыя суткі. Інтэрнэт, сацыяльныя сеткі, рэклама, камерцыйныя аб'явы, тэленавіны, кінафільмы, музыка, мноства радыёстанцый... Аўтаматычныя сэрвісы падказваюць нам, што купіць і дзе, у якую турфірму звярнуцца, з кім пазнаёміцца, што пачытаць... Медыя інтэграваныя ў наша жыццё настолькі, што большасць паведамленняў мы атрымліваем у фонавым рэжыме, не звяртаючы на іх увагі.**

— Інфармацыя самага рознага кшталту не проста льецца патокам, а «вучыць» маладое пакаленне, выхоўвае яго, пакідаючы далёка ззаду бацькоў і педагогаў з іх патрабаваннямі, муштраваннем і маралізатарствам, — дапаўняе настаўнік фізікі Сяргей Фадзін. — Сёння казаць пра ўплыў інтэрнэту на дзяцей і падлеткаў у прынцыпе няправільна, бо ён стаў для іх асяроддзем пражывання. Межы паміж віртуальным і рэальным жыццём паступова сціраюцца... Наш дыстанцыйны курс падыходзіць для тынэйджараў, якія хочуць «пасябраваць» з медыя, глядзець на свет самастойна і прымаць свае ўласныя рашэнні ў эпоху інфармацыйнага буму і хуткіх перамен, а таксама тым, хто хоча зрабіць апгрэйд і набыць навыкі высокага ўзроўню ў галіне інфармацыйнай і лічбавай адукаванасці.

Перш чым прыступіць да вывучэння модуляў, усім падлеткам прапануецца прайсці тэст, каб даведацца, наколькі прасунутымі спажыўцамі медыякантэнту яны з'яўляюцца. Напрыклад, ці ведаеце вы, адкуль узялося слова «спам»? А на якое паняцце брытанскія ўлады пастанавілі замяніць у афіцыйных дакументах тэрмін «fake news»? Што такое клікбэйт? У якой сацыяльнай сетцы больш за ўсё ботаў — акаўнтаў, якія кіруюцца праграмамі, арыентаванымі на маніпуляцыі і змяненне грамадскай думкі?

Дыстанцыйны курс складаецца з трох навучальных модуляў: «Ахоўнікі МедыяСусвету ці як стаць Фэйкхантарам», «Вялікі брат сочыць за намі?» і «Фантастычны медыякантэнт і дзе ён «жыве»?»

Першы модуль прысвечаны ўменню распазнаваць фэйкі. Той, хто яго паспяхова пераадолее, можа лічыць сябе вопытным «паляўнічым» на іх (фэйкхантарам). Другі модуль прысвечаны бігдаце — падлеткі даведаюцца, навошта ў сецівe збіраюцца звесткі пра нас, як абараніць свае персанальныя даныя, як адключыць рэкламу і як не пакідаць глабальных слядоў у інтэрнэце. Трэці модуль закранае такія важныя праблемы, як захаванне аўтарскага права, адказнасць за інфармацыю, якую ты размяшчаеш у сецівe ці робіш яе перапост (блогерам сёння можа стаць абсалютна кожны), што такое варожасць у інтэрнэце, як ствараць уласныя цікавыя інфармацыйныя нагоды, каб захапіць сваім кантэнтам аўдыторыю, і іншыя.

— Наш дыстанцыйны курс можна праходзіць абсалютна ў любы час і з той хуткасцю, якая будзе зручнай для падлетка, — падкрэслівае Таццяна Фадзіна. — У кожны модуль уключаны практычныя заданні, відэакантэнт, інфаграфіка. Але курс пабудаваны такім чынам, што перайсці да наступнага модуля будзе немагчыма, не прайшоўшы цалкам папярэдні. Напрыканцы мы просім падлеткаў падзяліцца сваімі ўражаннямі ад навучання: што было для іх найбольш захапляльным, карысным і складаным? Дыстанцыйны курс «Бачу. Чую. Разумею» знаходзіцца на платформе CANVAS https://canvas.instructure.com/courses/1516405, якая прызначана для размяшчэння масавых адкрытых анлайн-курсаў.

— Інтэрнэт-прастора ўяўляе сабой сёння сапраўдную «кашу», такі своеасаблівы інфармацыйны «фаст-фуд», дзе можна знайсці ўсё, што заўгодна: і сайты ультраправых арганізацый, і блогі, і забаўляльныя рэсурсы, і сур'ёзныя навуковыя работы, — разважае Сяргей Фадзін. — І як у гэтым моры не патануць? Як адрозніць факты ад інтэрпрэтацыі? Як не трапіць на кручок да махляроў, распазнаць тэхнікі маніпуляцыі («схаваную рэкламу», «гульню на эмоцыях» і іншыя)? Спадзяёмся, што наш дыстанцыйны курс стане дадатковым штуршком для развіцця медыяадукаванасці ў новага пакалення.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Не вучобай адзінай*

# О, ГЭТЫЯ НЕЗАБЫЎНЫЯ ПАХІ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ!

**Фантастычныя, ап'яняльныя, апетытныя, яны прывялі нас у інтэрнат БДУ № 7 на «Кулінарны конкурс», арганізатарам якога традыцыйна з'яўляецца Студэнцкі гарадок. За тытул сапраўдных майстроў кухні прыйшлі пазмагацца восем камандаў інтэрнатаў вядучай ВНУ. Кожная старалася раскрыць тэму гастранамічнага паядынку «Дамашняя кухня», расказаць пра сямейныя традыцыі, а таксама сардэчна прыняць гасцей ды здзівіць сервіроўкай стала і падачай страў. Адзінай складанасцю было абавязковае выкарыстанне аднолькавага базавага набору прадуктаў: свініна, бульба, цыбуля, морква, курыныя яйкі, сыр, свежыя памідоры, маянэз. Яшчэ дзейнічала абмежаванне па часе — дзве гадзіны. Толькі прыгажун-пірог з начыннем можна было прыгатаваць загадзя. У каго ў выніку атрымалася лепш за ўсіх?**









...Спачатку водар прывёў нас да гаспадынь з сёмага інтэрната. Па актыўных дзеяннях адразу было відаць: настрой — баявы, дзяўчаты «запраграмаваныя» на перамогу. Ды і не дзіўна: кухню ж яны прадстаўляюць не простую, а каралеўскую! Але ж як ёй навучыцца? Адна з удзельніц падчас гатавання паспела расказаць: «У мяне вялікая сям'я. Мама працуе дапазна, а тата вельмі любіць смачна паесці. Таму я іх часам выратоўвала».

Каманда з інтэрната № 6 вырашыла падысці да тэмы з невідавочнага боку. «Дамашняя, дом... Белы дом!» — пакруцілі яны словы, і пачалі гатаваць прыём у традыцыях ЗША. Успомнілі: калісьці прэзідэнт Дональд Трамп падаў гасцям стравы хуткага прыгатавання, фастфуд — бургеры, бульбу фры, курыныя нагетсы... Студэнты не згодныя са стэрэатыпам, што ён — шкодны для здароўя. Па сутнасці, гатавалі ж яны па-нашаму: смажылі бульбу, цыбульныя кольцы, корн-дог (сасіскі ў паніроўцы)... Усё тое, што робяць дома.

...Пакуль кухары змагаліся з плітамі і духоўкамі, іх групы падтрымкі прадстаўлялі творчыя нумары на сцэне. Прастора актавай залы напоўнілася беларускімі песнямі, танцамі з народнымі матывамі, сцэнкамі, жартамі і смехам. Пабывалі госці нават на грузінскім вяселлі! «Кухарачкі» зладзілі інтэрактыўную «Званую вячэру». Яны запрашалі гасцей да адмысловай скрыні, куды трэба было засунуць рукі і навобмацак адгадаць, што за прадукты туды паклалі.

У творчай абароне зноў вылучыўся інтэрнат прымаючага боку. Нездарма іх каманда назвалася «Classic muZik — не праглыні язык», дзе спалучыліся намёк на смачныя стравы і класіку мінулых вякоў. У выкшталцоных сукенках і камзолах (якія, як прызналіся, шылі самі), яны прадэманстравалі бальны танец з іранічнымі песнямі пад жывую скрыпічную музыку, чым і сарвалі бурныя авацыі. А пасля пачалі тонка жангліраваць гастранамічнымі жартамі ў духу размоў XIX стагоддзя.

— Мама́, мама́, мне так падабаецца масье багет, але ён не звяртае на мяне ўвагі. Водзіцца толькі са сваімі фрыкадэлькамі!

— Запомні: шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз страўнік, але можна і зрэзаць — праз печань!

* * *

— Масье маянэз, масье маянэз?

— Гэты гуляка ад'ехаў у Правансаль разам з аліўе.

— Не вешайце мне локшыны на вушы, масье Вермішэль!

...Пад канец праграмы ўсё мацней адчуваліся дзівосныя пахі прыгатаваных страў. Чаго толькі не бачылі вочы ў той вечар! Ні адзін рэстаран так бы не здзівіў, як студэнты БДУ. Бужаніна з бульбай па-вясковаму, свініна з гароднінай, тарталеткі з курыцай і грыбамі, брускеты з мяккім сырам і памідорамі... А каманда «11 грузін» цалкам апраўдала сваю назву і прэзентавала мяса ў гаршчэчках, сацыві з курыцы, хачапуры па-аджарску.

Мабыць, вы ўжо здагадаліся, што жыхары «сямёркі» заслужана перамаглі, бо змаглі здзівіць журы па ўсіх пунктах. Адзначыла камісія таксама каманды — «Весялуху» з інтэрната № 1 і «11 грузін» з інтэрната № 11, якія занялі другое і трэцяе месцы адпаведна.

Напрыканцы ўсе ахвотныя змаглі ўпэўніцца ў аб'ектыўнасці суддзяў і самі пакаштаваць стравы. Такім прыемным акордам завяршыўся цудоўны вечар.

**Юлія АДАМОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Ход канём*

# ЯПОНСКІЯ, А ЯК РОДНЫЯ

**Беларускія спартсмены чарговы раз прадэманстравалі сваё майстэрства на сусветных спаборніцтвах па сёгі. Гэтым разам віцэ-чэмпіёнам свету і бронзавым прызёрам чэмпіянату Еўропы стаў 17-гадовы студэнт факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Антон СТАРЫКЕВІЧ. У турніры прымалі ўдзел больш за сто наймацнейшых гульцоў з розных краін, у тым ліку з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Расіі, ЗША, Францыі і Японіі.**




Гэтыя шахматы атрымалі немалую папулярнасць у нашай краіне, а беларуская школа сёгі стала наймацнейшай у Еўропе. У Японіі ж гульня ўжо даўно перастала быць проста хобі ці спортам і ператварылася ў сапраўдную рэлігію. Часта сёгі там выкарыстоўваюць замест сумоўя перад працаўладкаваннем, таму што японскія шахматы выдатна паказваюць узровень эрудыцыі чалавека. Каб даведацца пра іх больш, мы пагутарылі з Антонам Старыкевічам і высветлілі, што трэба для таго, каб стаць прафесіяналам у гэтай гульні, і чым жа сёгі адрозніваецца ад традыцыйных шахмат.

На самай справе адрозненняў нашмат больш, чым падабенстваў. Напрыклад, дошка ў японскіх шахматах 9х9 (у традыцыйных поле 8х8), усе фігуры плоскія, пяцівугольнай формы і аднаго колеру. Хоць паняцце «чорныя» і «белыя» ўсё роўна ёсць, яно адлюстроўвае чарговасць ходу, чорныя ў сёгі ходзяць першымі. На драўляных дошчачках намаляваны іерогліфы, якія і пазначаюць назву фігуры і яе магчымасці. Так, ёсць кароль, конь, пешка, ладдзя і слон, аднак не ўсе яны ходзяць гэтак жа, як у традыцыйных шахматах.



Антон пазнаёміўся з сёгі ў сталічным Палацы дзяцей і моладзі ў 11-гадовым узросце і захапіўся гэтай гульнёй практычна адразу. Хоць, успамінае ён сёння, спачатку не асабліва думаў над хадамі, не пралічваў камбінацыі. «Больш хацелася проста пагуляць і пагутарыць з хлопцамі», — з усмешкай адзначае цяперашні віцэ-чэмпіён. З тых часоў мінула шэсць гадоў, за іх ён паспеў дасягнуць чацвёртага дана. У японскіх шахматах імі вымяраецца майстэрства гульца, самы высокі дан у аматараў — шосты, але пакуль яго маюць толькі японцы, ніхто з еўрапейцаў не змог дасягнуць выніку вышэй за чацвёрты.

— У Краіне ўзыходзячага сонца нават не ведаюць пра існаванне класічных шахмат, хутчэй за ўсё яны спытаюць: «А нашы што, не класічныя?» — кажа Антон. — Там сёгі навучаюць кожнае дзіця, лічыцца, што гэтая гульня развівае логіку і вельмі дапамагае ў матэматычных сферах. Шмат хто ў Японіі захапляецца сёгі, як хобі, але таксама там гэтая гульня існуе як спорт, праўда, прабіцца ў прафесіяналы даволі цяжка. Для гэтага трэба скончыць спецыяльную школу па сёгі — сёрыкай. Каб туды трапіць, для пачатку трэба здаць уступны экзамен: прэтэндэнт паказвае, што ведае тэарэтычную базу. Затым прад'явіць рэкамендацыю для навучання ад прафесійнага гульца і заплаціць пяць тысяч долараў. Аднак паступіць туды палова справы: у школе раз у паўгода праводзяцца турніры для вучняў, і, каб паспяхова яе скончыць, трэба выйграць тры такія турніры і дасягнуць тым самым чацвёртага дана. Усё гэта трэба зрабіць да 25 гадоў. Тыя, хто становяцца прафесіяналамі, гуляюць у турнірах выключна з роўнымі сабе і змагаюцца за японскія тытулы. Адзіным чалавекам з Еўропы, каму ўдалося скончыць гэтую школу, з'яўляецца дзяўчына з Польшчы.

Удзельнічаць у чэмпіянатах свету і Еўропы па сёгі могуць толькі аматары, кім і лічацца беларускія спартсмены. Асацыяцыя сёгі Японіі адпраўляе на гэтыя міжнародныя турніры па некалькі сваіх прафесійных гульцоў, але толькі для трэніровачных партый. Антон Старыкевіч таксама сустракаўся з імі і нават перамагаў. Названыя спаборніцтвы з'яўляюцца самымі прэстыжнымі турнірамі сярод аматараў, таму сваю «бронзу» і «серабро» Антон успрыняў з радаснымі эмоцыямі.

**Хлопец перакананы, што беларуская школа сёгі самая моцная пасля японскай у свеце.**

— На самай справе ў Браціславу я ехаў з адзінай задачай — не прайграць у першым туры, як гэта было два гады запар. Хацелася проста паказаць свой узровень гульні. Таму задаволены выступленнямі, хоць у іх і была доля шанцавання. За другое месца на чэмпіянаце свету атрымаў кубак, роспіс прафесіянала і веер з пажаданнямі ад прафесіяналаў сёгі. Сумна, але большасць турніраў праходзяць без грашовых прызоў, з-за гэтага многія сыходзяць, напрыклад, у кітайскія шахматы, дзе круцяцца даволі вялікія сродкі. У сёгі, наколькі я ведаю, ёсць літаральна некалькі спаборніцтваў, дзе існуе прызавы фонд, адзін з іх — калядны турнір у Кракаве, за першае месца можна атрымаць сімвалічныя грошы — долараў сто, — адзначае Антон.

Хлопец перакананы, што беларуская школа сёгі самая моцная пасля японскай у свеце.

— У нас многа тых, хто вучыць дзяцей сёгі, таму працэс ідзе добра. Шмат выдатных гульцоў таксама сканцэнтраваны ў Нідэрландах, Расіі і Германіі. Вялікім нашым плюсам з'яўляецца яшчэ і тое, што ў Беларусі праводзіцца вялікая колькасць турніраў, спартсмены гуляюць шмат партый, за кошт чаго падымаюць свой рэйтынг. У Еўропе ж спаборніцтваў мала, таму многія маюць добры ўзровень, але пры гэтым не такі вялікі рэйтынг. Наогул, сёгі вельмі непрадказальная гульня, тут другакласнік можа перамагчы прафесара, вынік у многім залежыць ад трэніровак. Напрыклад, я набіраўся майстэрства менавіта на практыцы, акрамя рэйтынгавых гуляю трэніровачныя матчы, гэта вельмі дапамагае.

Сёння ў Антона больш за тысячу рэйтынгавых партый. Аб сваіх наступных жаданнях і мэтах хлопец кажа з асцярожнасцю, не хаваючы, што чэмпіянат свету — турнір, які ўсё ж такі хацелася б выйграць. Таксама ў яго найбліжэйшых задачах спаборніцтвы ў Празе.

— Пераможца атрымае бясплатную паездку ў Японію, таму мне вельмі хацелася б перамагчы там, — дзеліцца планамі Антон. — У гэтай краіне вельмі карысна пабываць хоць бы ў плане вопыту спаборніцтваў з мясцовымі гульцамі. І яшчэ адзін фактар: у нас вельмі цяжка дастаць тэарэтычны матэрыял па сёгі, а ў Японіі гэтыя кніжкі прадаюцца літаральна на кожным кроку. Думаю, узяў бы з сабой асобны чамадан для кніг.

У будучыні Антон Старыкевіч не збіраецца кідаць сёгі, а ў прафесіі бачыць сябе ў IT-сферы. Зараз ён навучаецца на першым курсе БДУІР. Што датычыцца вольнага часу, то з-за вучобы і захаплення японскімі шахматамі яго застаецца не так шмат, але Антон любіць пешыя прагулкі і прагляд серыялаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

*Бачыць мэту*

# МОВА, ЗОРЫ, МАРА...

**Зараз Міраслава БУЛГАКАВА — студэнтка першага курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ спецыяльнасці «інфарматыка». За плячыма — навучанне ў гімназіі № 4 Мінска, пазней — у Ліцэі БДУ на фізічным профілі. Сёлета ў Венгрыі дзяўчына заваявала бронзавы медаль на VIII Міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы сярод школьнікаў.**

— Зацікаўленасць астраноміяй пачалася з зацікаўленасці фізікай. У восьмым класе папрасіла бацькоў, каб яны адвялі мяне да рэпетытара па гэтым прадмеце, бо ў школе не атрымлівалася рашаць некаторыя задачы, — расказвае Міраслава. — Настаўнік Аляксандр Зязюля заахвоціў гэтай навукай, я і не падазравала, наколькі яна набліжаная да жыцця. Калі б рэпетытар не змог давесці зразумелай мовай, што такое фізіка, хутчэй за ўсё, я не займалася б ёй надалей. Многае адразу не атрымлівалася, давялося шмат працаваць. У дзявятым класе пайшла ў Ліцэй БДУ на падрыхтоўчыя курсы, вельмі хацела апынуцца ў ліку залічаных на фізічны профіль. Акрамя таго, займалася самастойна. Намаганні аказаліся недарэмнымі, я стала ліцэісткай і была вельмі гэтаму рада.

У 11 класе суразмоўніца пачала рыхтавацца да алімпіяды па астраноміі і трапіла на міжнародны этап. Ці быў гэта імгненны сакрэт поспеху?

— Бронзавы медаль на міжнароднай алімпіядзе — вынік сур'ёзнай штодзённай падрыхтоўкі і майго жадання прадэманстраваць веды ў тым, што мяне цікавіць, — кажа суразмоўніца. — Мне заўсёды падабаліся спаборніцтвы, таму хацелася паглядзець на ўзровень іншых удзельнікаў і параўнаць яго з асабістым. Каб добра падрыхтавацца, падчас вучобы звярнулася да цудоўнага выкладчыка Ліцэя БДУ — Віктара Васілевіча Малышчыца. Лічу, што вынік, якога я дабілася сёлета ў Венгрыі ў складзе беларускай каманды, у большасці яго заслуга. Дарэчы, свае факультатывы педагог заўсёды праводзіў па-беларуску.

Гэтую акалічнасць дзяўчына не лічыць нечым незвычайным, бо бацькі з дзяцінства выхоўвалі яе толькі па-беларуску, да чатырох гадоў Міраслава не ведала іншай мовы. Зараз у большасці выпадкаў яна таксама размаўляе на роднай.

Згадваючы міжнародны этап, дзяўчына растлумачыла, чым ён адрозніваўся ад папярэдніх:

— Самай цяжкай аказалася работа з тэлескопам, бо на рэспубліканскім узроўні ніякага абсталявання не было. На спаборніцтвах у Венгрыі было многа нестандартных і складаных задач, а таксама вялікая канкурэнцыя.

Астраномія прываблівае Міраславу тым, што пры вывучэнні навукі шмат працуе фантазія. Любімы раздзел для дзяўчыны — касмалогія. Яна вывучае эвалюцыю нашага Сусвету і стараецца даць адказы на розныя пытанні: «з чаго ўсё пачалося?», «што чакае Сусвет у будучыні?» і гэтак далей.



Міраслава з камандай на міжнародным этапе ў Венгрыі.

У Міраславы ёсць маленькая мара — стварыць свой анлайн-планетарый. У ім можна будзе ўбачыць нябесную сферу з зоркамі, планетамі і спадарожнікамі, каметамі і метэорамі. Пакуль што гэта толькі ідэя: не хапае вопыту, каб яе ажыццявіць, але дзяўчыне хацелася б рэалізаваць сваю задуму.

— Ведаю, што табе прапаноўвалі рыхтаваць школьнікаў да алімпіяды па астраноміі...

— Так, ад Ліцэя БДУ. Я і не супраць, але з-за вучобы ва ўніверсітэце не ўпэўнена, ці атрымаецца сумяшчаць гэтыя заняткі. Калі што — з радасцю паспрабую сябе ў новай якасці, думаю, што змагу чамусьці навучыць дзяцей, якія захоплены астраноміяй.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Рухавік эмоцый*

# ЧАМУ СПЯВАЮЦЬ НА ТРАСЕ,

## або Гонкі за дозай адрэналіну

— Гэты драйв адчуваю ўнутры з дзяцінства, я быццам хворы на іх, — усміхаючыся, кажа Аляксандр МАЦВЕЕЎ. — Пасля таго як скончыў аўтатрактарны факультэт БНТУ, стаў трэнерам для дзяцей у адной са сталічных картынг-школ. Да таго ж заняўся грамадскай дзейнасцю — цяпер я старшыня арганізацыі «Белкартынг-спорт». З яе дапамогай мы развіваем і папулярызуем гэты кірунак, шукаем пляцоўкі для гоншчыкаў, прымаем удзел у розных мерапрыемствах.

На тэрыторыі школы на ўсю моц равуць маторы — у хлопчыкаў і дзяўчынак пачалася трэніроўка. Аляксандр тлумачыць, што ў іх ні адны заняткі не абыходзяцца без парад трэнера, інструктажу, а таксама традыцыйнай фразы «З халоднай галавой і гарачым сэрцам», якая адлюстроўвае патрэбнае стаўленне да спорту. Толькі пасля можна на трасу.

— Яна ў нас складае 280 метраў. Другая знаходзіцца на аэрадроме Баравая, там у распараджэнні гоншчыкаў больш за адзін кіламетр дарогі, — расказвае трэнер.

Аляксандр адзначае, што ў кожнага дзіцяці свой стыль ваджэння. Хтосьці шустры ў жыцці, такі ж і на трасе. І наадварот. Але збольшага рысы характару ніяк не ўплываюць на перамогі. Гэта заўсёды непрадказальная гульня.

— Калі гоншчык за рулём, у яго абсалютна свае думкі і дзеянні. Дзяўчынкі часта спяваюць, прычым вельмі гучна, нехта штосьці крычыць, бо зашкальвае адрэналін, а хтосьці маўчыць. Каб дзеці адчувалі сябе на трасе больш упэўнена, падчас заездаў мы дзелім іх на тры групы: першая — для самых хуткіх, другая — для тых, хто едзе павольней, ну і трэцяя — для пачаткоўцаў. Заезд доўжыцца па 10—15 хвілін, за адну трэніроўку іх у сярэднім выходзіць на кожнага па чатыры-пяць. Агулам хлопцы і дзяўчаты праводзяць за рулём амаль дзве гадзіны. Маючы вялікі досвед работы з дзецьмі, магу з упэўненасцю сказаць, што тых, хто «хварэе» на картынг, відаць адразу. Для іх галоўнае — хутчэй сесці на месца кіроўцы. А магчымасцяў для гэтага цяпер у моладзі больш, чым гадоў дзесяць таму. У маім дзяцінстве 15 чалавек напераменку ездзілі на адной машыне, а цяпер у кожнага на картадроме ўласны карт.





**«Да нас прыходзяць дзеці са страхам у вачах, але хутка ён знікае і з'яўляюцца азарт, цікавасць».**

Трэнер успамінае, што калі быў шасцігадовым дзіцем і наведваў юнацкую спецыялізаваную спартыўна-тэхнічную школу, адразу вызначыўся з мэтай на будучыню. Такую ж цвёрдасць у думках заўсёды чакае і ад сваіх выхаванцаў:

— Як і ў любой справе, галоўнае для дасягнення поспеху — перыядычнасць. Чым больш стартаў зробіш за сезон, тым больш удалых фінішаў атрымаеш. Зразумела, бываюць неспадзяваныя выпадкі накшталт дрэннага настрою або самаадчування, якія могуць перашкаджаць добрым вынікам, аднак часцей за ўсё на гоначнай трасе гэта адыходзіць на другі план. Інакш кажучы, тое, як ставіўся да трэніровак хлопец або дзяўчына на працягу года, наколькі ён або яна былі мэтанакіраваныя, бачна падчас закрыцця сезона.

У краіне вялікіх картадромаў усяго некалькі. Гэта стварае значную праблему для аматараў, якіх хапае. Бо картынг — самая масавая і папулярная аўтамабільная гоначная дысцыпліна ў свеце.

— Тут няма абмежавання па ўзросце, — дадае Аляксандр. — Пачынаючы з пяці гадоў дзеці ўдзельнічаюць у спаборніцтвах рознага маштабу. Дапушчальная хуткасць на трасе залежыць ад узросту: хлопчыкі і дзяўчынкі да сямі-васьмі гадоў выціскаюць 50—70 кіламетраў у гадзіну, тыя, каму больш за чатырнаццаць—шаснаццаць, — 110—120 кіламетраў.

Цікава, што вага для гоншчыкаў на трасе значыць многае.

— Гоншчыкаў-пачаткоўцаў ад прафесіяналаў адрозніваюць дзве-тры секунды. 20 лішніх кілаграмаў — лішнія паўсекунды з круга. А гэта вялікая страта для тых, хто хоча перамагчы ў спаборніцтвах. Бывае, што дзіця вельмі худое, але гэта можна выправіць, дадаўшы вагу ў выглядзе экіпіроўкі. А калі яна залішняя, вынікі могуць атрымацца няўдалыя, — тлумачыць трэнер.

— Часта, калі дэманструюцца заезды на картах, акцэнт робіцца на аварыях. Наколькі такія здарэнні распаўсюджаныя?

**Картынг — самая масавая і папулярная аўтамабільная гоначная дысцыпліна ў свеце.**

— Прыкладна адно-два за сезон. Гоншчык можа выпасці з машыны, пашкодзіць экіпіроўку, атрымаць нейкія вывіхі, але сур'ёзныя наступствы — рэдкасць. Картынг-школы якраз і існуюць для таго, каб даваць тэарэтычныя і практычныя веды. Да нас прыходзяць дзеці са страхам у вачах, але хутка ён знікае і з'яўляюцца азарт, цікавасць.

— Дарэчы аб спаборніцтвах. Як часта выступаеце на іх?

— Імкнёмся ўдзельнічаць усюды, дзе толькі можам. Напрыклад, на гоначных серыях «Малыш», Rotax Max, Rotax Max Mini, Open, KZ, якія праходзяць у нашай краіне. Разам з іншым трэнерам школы Аляксандрам Шчалканавым мы рыхтуем чэмпіёнаў, зараз іх у нас 12. Выхаванцы заваявалі 126 кубкаў, і на гэтым мы не збіраемся спыняцца. Больш за 10 разоў дзеці станавіліся пераможцамі чэмпіянату і першынства краіны па картынгу, больш за 20 разоў — іх прызёрамі. Некалькі разоў яны выйгравалі міжнародныя спаборніцтвы «Кубак Балтыі», куды прыязджаюць наймацнейшыя гоншчыкі з розных краін. Радуе, што за апошнія гады колькасць зацікаўленых дзяцей значна павялічылася.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# Цуды ў паветры




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**— Вышыня размяшчэння кальца падчас выступлення змяняецца?**

— На ім можна працаваць як на адной вышыні, так і падымаючы ці апускаючы снарад. На жаль, у нас не так шмат пляцовак, дзе яго можна рэгуляваць. Таму часцей за ўсё выступаем на адной вышыні. Максімальная, на якой мне даводзілася працаваць, — 3-3,5 метра.

**— Занятак у студыі — работа ці ўсё ж хобі?**

— Не магу адназначна адказаць. Кальцо для мяне цяпер хобі, якое па шчаслівай выпадковасці з'яўляецца яшчэ і работай. Калі прыходзяць вучні, я адказна падыходжу да выканання трэнерскіх функцый, але ў той жа час мы можам пажартаваць і пагаварыць, што робіць трэніроўку больш жывой і цікавай. Акрамя выкладання ў мяне ёсць яшчэ іншая спецыяльнасць — маркетолаг-эканаміст. Таму днём я працую ў гэтай сферы, а ўжо па вечарах вяду групы па паветраным кальцы.

**— У вас такі загружаны графік... Як на гэта глядзяць блізкія?**

— Вельмі нават станоўча! Муж займаецца разам са мной у студыі. Ён танцуе, у тым ліку pole dance, а нядаўна нават рыхтаваў нумар са мной на паветраным кальцы. Магу сказаць, што ён заўсёды падтрымлівае мае захапленні, якімі б вар'яцкімі яны ні здаваліся на першы погляд. Бацькі таксама з задавальненнем прыходзяць паглядзець на нашы выступленні, аднак часцяком дзівяцца, адкуль у мяне ёсць сілы на ўсё.

**«Большасць маіх вучняў — дзяўчаты. На кальцы можна зрабіць вельмі шмат прыгожых і жаноцкіх элементаў з прагінам і шпагатамі, што і прыцягвае».**

**— Ці кожны ахвотны можа прыйсці да вас?**

— Каб пачаць займацца на паветраным кальцы, не патрабуецца нейкай спецыяльнай падрыхтоўкі. З пачаткоўцамі праходзім усе самыя галоўныя базавыя элементы: заходы на кальцо, вучымся «лавіць» баланс і трэніруем сілу рук. Пасля дзвюх-трох трэніровак нават у тых, хто пачаў «з нуля», пачынаюць упэўнена атрымлівацца тыя самыя базавыя элементы. Вядома, большасць маіх вучняў — дзяўчаты. На кальцы можна зрабіць вельмі шмат прыгожых і жаноцкіх элементаў з прагінам і шпагатамі, што і прыцягвае. Аднак і для хлопцаў ёсць не менш эфектныя сілавыя трукі, проста яны не такія папулярныя. Зараз у мяне ў групе адзін малады чалавек.

**— А дзеці могуць займацца гэтым відам спорту?**

— Вядома ж. Больш за тое, дзякуючы кальцу можна добра развіць гнуткасць і сілавыя паказчыкі ўжо з дзяцінства. Я думаю, такія заняткі можна паставіць у адзін шэраг з трэніроўкамі па гімнастыцы. Але асабіста я дзіцячыя групы не вяду.

**— Часта выступаеце?**

— Так, бывае з групай, дуэтам ці сольна. Але далёка не ўсе мае выступленні звязаны з паветраным кальцом. Паралельна з работай на гэтым снарадзе актыўна ўдзельнічаю ў харэаграфічных нумарах. Мы з танцавальнай групай перыядычна выступаем на канцэрце беларускага гурта «Без панікі». Гэтак жа ў дуэце з мужам прадстаўлялі нашу студыю на чэмпіянаце спорту і танца на пілоне. Зараз прымаю ўдзел у пастаноўках студыі танца Вольгі Рэпінай. Улетку мы прэзентавалі тэатр танца Contextus «Выхад з зоны к». У ім перапляталіся гісторыі кахання, якія былі пададзеныя праз танец, і акрабатычныя нумары на палатне, кальцы і пілоне.

**— Якая цяпер галоўная мэта?**

— Планую падрыхтаваць годны нумар на паветраным кальцы для выступлення на міжнародных спаборніцтвах.

**— Ці бываюць у вас моманты ляноты? Што матывуе ў такіх сітуацыях?**

— Вядома, здараюцца. А ў дні восеньскай шэрасці і волкасці лянота рабіць абсалютна ўсё. Для мяне ў такія моманты галоўнае — дабрацца да залы, бо там пачынаюць адбывацца сапраўдныя цуды. Якая б стомленая ні была, варта толькі пачаць размінацца, і ўсё самотнае кудысьці знікае. Асабліва люблю групавыя заняткі, калі побач людзі, якія з табой на адной хвалі. Мне здаецца, што менавіта атмасфера ў нашай зале прымушае мяне з дня ў дзень перасільваць ляноту і ісці на трэніроўку. А найлепшая матывацыя — дасягненні мае і маіх вучняў. Радасць і эйфарыя, якія дастаўляе нарэшце выкананы элемент, даюць энергію і сілы для новых здзяйсненняў.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Idea Bank

Наименование банка:

## ЗАО «Идея Банк»

www.ideabank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2019 года

ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2019 | на 1 января 2019 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 40 510 | 43 684 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 30 346 | 53 778 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 32 037 | 19 942 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 16 012 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 316 831 | 285 313 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 5 | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 24 391 | 28 408 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 7 376 | 7 437 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 2 467 | 88 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 14 683 | 20 028 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 484 658 | 458 683 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 4 428 | 17 650 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 379 756 | 335 478 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 11 396 | 4 120 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 105 | 3 284 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 398 685 | 360 532 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 40 000 | 40 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 7 523 | 7 523 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 10 478 | 10 634 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 27 972 | 39 994 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 85 973 | 98 151 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 484 658 | 458 683 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 3-й квартал 2019 года

ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 1 октября 2019 | на 1 октября 2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 36 707 | 35 313 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 18 421 | 13 596 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 286 | 21 717 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 11 072 | 8 863 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5 065 | 8 173 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6 007 | 690 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (1) | (4) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 958 | 9 688 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 000 | (4 273) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 2 390 | 2 413 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24 644 | 27 445 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 328 | 1 971 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 668 | 9 361 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 860 | 2 627 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 808 | 6 734 |

Председатель Правления Е.М. Папушева

Главный бухгалтер О.В. Глазырина

9 октября 2019 года

Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года.
УНП 807000122

Утерянный представительством Белгосстраха по Копыльскому району страховой полис по добровольному страхованию имущества граждан формы 2РН, серии ИГ, № 7956297, в количестве 1 шт., считать недействительным. УНП100122726

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 18 НОЯБРЯ 2019 ГОДА АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В ДЕРЕВНЕ СЫЧКОВО БОБРУЙСКОГО РАЙОНА

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Бобруйский район, Сычковский сельсовет, д. Сычково, ул. Центральная, 67А | 4972,97 | 497,30 | **(1864,81+ расходы за рекламу)** (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,2160 га | 720884009601000464 | Имеются ограничения в использовании – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, зона санитарной охраны в местах водозабора. Имеется возможность подключения к централизованному электроснабжению, водоснабжению, газоснабжению. | 18.11.2019 | 12.11.2019 до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ.** Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 60, в рабочие дни с 8.00 до 17.00 с 1-го дня после публикации извещения в СМИ. Контактные телефоны в Бобруйске: **(8 0225) 71 74 30, 74 82 94, 72 05 40.**

1. Условия аукциона:

– для участия в аукционе гражданин, негосударственное юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, в комиссию предоставляются:

а) гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

б) представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность;

в) представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

Граждане, негосударственные юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка (задатков).

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

2. Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии или организации и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

3. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10 %.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет: Сычковского сельского исполнительного комитета BY49AKBB36007121100170000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК банка AKBBBY2X, УНН 700451296, код платежа в бюджет 04901.

5. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи в Сычковском сельисполкоме, отделе землеустройства Бобруйского райисполкома.

7. Продажа земельного участка производится без изменения целевого назначения.

8. Сычковский сельский исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 рабочих дня до назначенной даты его проведения.

9. Земельный участок сформирован для проведения аукциона со следующими условиями для победителя либо единственного участника несостоявшегося аукциона:

– в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за вычетом суммы задатка за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участниками документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлению победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;

– в течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона либо протокола о несостоявшемся аукционе обратиться за государственной регистрацией прав на земельный участок в Бобруйский филиал РУП «Могилевское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (г. Бобруйск, ул. Пролетарская, 35);

– приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями их предоставления в течение одного года со дня получения свидетельства о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него;

– получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, обеспечить разработку строительного проекта на строительства объекта в установленный законодательством срок;

– после получения разрешения на строительство снять на земельном участке плодородный слой почвы из-под пятен застройки и использовать его для благоустройства участка;

– завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

